Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

ПЯТНІЦА
29 красавіка 1932 г.
№ 96 (3485)

ТЭЛЕФОНЫ:
Адказн. рэдактара 7-69
Адказн. сакратара 4-78
Сакратароў . 6-15
Начная рэдакцыя . 12-65 (два зваінкі)
Выдавецтва . 2-44

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 1 руб.
3 „ . . . 3 „
6 „ . . . 6 „
Падписка принимается выключна за месяц і лістаносцамі.
Рукапісы не звяртаюцца

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА
МІНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.

КОШТ АБЧЫВЫ
1 радок калонкарай 1 руб.

КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ
аб шубе і дакументу—3р.

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—Трэцяя гадавіна сацыялістычнага спаборніцтва.

Савецкі Саюз і Турцыя «Известия». А. СТАЛЕВІЧ і О. КОНАКОЦІН. Да пытаньня аб беларускай мове (4 ст.). Нарыс П. ШАСТАКОЎ. Насустрач сонцу! (2 і 3 стар.).

Надзвычайны зьезд саветаў Койданаўшчыны (1-ая стар.)

ВЫШЭЙ СЬЦЯГ ЛЕНІНСКАГА СПАБОРНІЦТВА.
Мільённыя масы працоўных Савецкага Саюзу змагаюцца за канчатковую пабудову бясклясавага грамадзтва. Яшчэ з большай настойлівасьцю ажыцьцяўляць шэсьць гістарычных умоў тав. СТАЛІНА (2-ая стар.).

СПАБОРНІЦТВА—МАГУТНЫ ВАГАР БАРАЦЬБЫ за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, арганізацыйна гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за ажыцьцяўленьне шасьці ўмоў тав. СТАЛІНА ў калгасным вытворчасьці і пасьляховае правядзеньне весьняной сяўбы. (3-ая стар.).

ЗА ГРАНІЦАЙ (4 стар).

Пастановы ЦК КП(б)Б. (4 стар.). Становішча на КУЧ. Сусьветны пралетарыят рыхтуецца да 1-га Мая.

Трэцяя гадавіна сацыялістычнага спаборніцтва

Трэцюю гадавіну сацыялістычнага спаборніцтва Савецкі Саюз сустракае на гістарычным рубяжы двух гераічных пяцігодак.

У пераможным сацыялістычным будаўніцтве знаходзіць свой выраз вось пяховая барацьба за выкананьне першай пяцігодкі ў 4 гады. За гэты час наша «цяжкая прамысловасьць пастаўлена цьвёрда на ногі, і тым самым створана ўласная база для завяршэньня рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі, база сацыялістычнай буйнай машыннай індустрыі». За гэты час Савецкі Саюз у выніку буйнейшых поспехаў сацыялістычнага і калгаснага будаўніцтва і шырокага ўжываньня машынай тэхнікі зрабіўся краінай самай буйнага ў сьвеце земляробства. За гэты час завершана будаўніцтва фундамэнту сацыялістычнай эканомікі, што азначае канчатковы падрыў карэньняў капіталізму ў вёсцы і ліквідацыю ў асноўным паразітычных элемэнтаў, побыце і беспаваротнае вырашэньне ў карысьць сацыялізму ленінскага пытаньня «хто каго?» і ў горадзе, і на вёсцы.

Чэм дамагліся мы гэтых перамог, якія маюць сусьветна-гістарычнае значэньне?

«Усе гэтыя поспехі,—чытаем мы ў рэзалюцыі XVII усесаюзнай партканферэнцыі,—абумоўлены выйсьцем вялізарнага росту рэвалюцыйнай актыўнасьці шырокіх мас рабочае клясы і працоўных сялян, выйсьцем вялізарнага ўздыму сацыяспаборніцтва і ўдарніцтва, нарэшце, выйсьцем ленінскай палітыкі нашай партыі, якая пасьлядоўна праводзіла разгорнутае па ўсім фронце наступленьне на капіталістычныя элемэнты».

Не выпадкова першы год пяцігодкі быў годам мацнага разгорнываньня сацыялістычнага спаборніцтва. Пяцігодка і сацыялістычнае спаборніцтва не адарваныя адно ад аднаго, непарыўна на вызначны ланцэк сабой. Пяцігодка зьяўлялася і зьяўляецца нашым сьцягам, прапрамай нашай барацьбы, для ажыцьцяўленьня якой неабходна гіганцкае напружаньне сіл, волі і энэргіі мільёнаў, гіганцкі вытворчы ўздым і энтузіязм мільёнаў і мільёнаў людзей. Сацыялістычнае спаборніцтва і асабліва вышэйшая форма яго—гаспадарча-разьліковыя брыгады, як нельга лепш адлюстравалі гэты вялізарны ўздым вытворчай актыўнасьці і творчага энтузіязму рабочае клясы і мас [illegible]

«Камунізм,—пісаў Ленін,—пачынаецца там, дзе зьяўляюцца самаадданыя, перамагаючыя няжкую працу, клопаты радавых рабочых аб павялічэньні прадукцыйнасьці працы...» У сацыялістычным спаборніцтве мы і бачым вырас тых новых вытворчых адносін, тых новых адносін да працы, якія склаліся ў нас, у СССР, на аснове разьвіцьця сацыялістычнай прамысловасьці і сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі. Прынцыпы камуністычных адносін да працы ўсё больш і больш укараняюцца ў вытворчасьць. Для мільёнаў праца ўжо зрабілася «справай гонару, справай славы, справай адвагі і геройства».

На справе, хто ў БССР ня ведае гераічнай работы брыгады Каверды, якая давала рэкордную здабычу торфу, хто ў БССР ня ведае гераічнай работы брыгады Дворкіна, якая давала рэкорды кладкі цэглы на будоўлях новых сацыялістычных фабрык і заводаў?! Такіх узораў, такіх прыкладаў у нас ня мала. І менна гэта акалічнасьць, іменна тое, што гутарка ідзе аб вытворчым энтузіязме мільёнаў, іменна гэта, пры правільнай генэральнай лініі нашай партыі, забясьпечыла нам гіганцкія перамогі.

І зараз, абапіраючыся на гэтыя перамогі, партыя паставіла перад трыма мільёнамі сваіх членаў, перад 6-мільённым ленінскім камсамолам, перад усёй рабочай клясай, многімі мільёнамі калгасьнікаў, бедакоў і сярэднякоў сьмелую, яркую і ў той-жа час зусім рэальную задачу: пабудаваць на працяку другой пяцігодкі бясклясавае сацыялістычнае грамадзтва.

Вось як сфармулявана гэта асноўная палітычная задача другой пяцігодкі ў рашэньнях XVII усесаюзнай канфэрэнцыі: «... канчатковая ліквідацыя капіталістычных элемэнтаў і клясаў вогул, поўнае зьнішчэньне прычыны, якія параджаюць клясавую розьніцу і эксплёатацыю, і перамаганьне перажыткаў капіталізму ў эканоміцы і сьвядомасьці людзей, пераўтварэньне ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва».

Ці азначае гэта, што сацыялістычнае спаборніцтва, якое магутна разгарнулася ў першую пяцігодку, пачне згортвацца ці зусім загасьне ў другую пяцігодку? Нічога падобнага! Такія гутаркі ня маюць нічога супольнага з лініяй партыі. «Сацыялізм,—пісаў Ленін,—ня толькі не загашае спаборніцтва, а наадварот, упяршыню стварае магчымасьць ужыць яго сапраўды шырока, сапраўды ў масавым разьмеры, упяршыню сапраўды большасьць працоўных на арэну такой работы, дзе яны могуць вызьвіць сябе, разгарнуць свае здольнасьці, вызьвіць таленты, якіх у народзе—непачатая крыніца і якія капіталізм мяў, давіў душыў тысячамі і мільёнамі».

Іменна зараз, калі мы завяршаем першую пяцігодку, калі мы—на рубяжы другой пяцігодкі, іменна зараз сацыялістычнае спаборніцтва павінна атрымаць яшчэ больш шырокае разьвіцьцё. Ператварыць усе працоўнае на сельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва—гэта перш за ўсё азначае зрабіць для ўсяго працоўнага насельніцтва краіны працу справай гонару, справай славы, справай адвагі і геройства, гэта значыць перш за ўсё ўцягнуць яго ў сацыялістычнае спаборніцтва. І тут перад намі вялізарнае поле дзейнасьці, тут перад намі гіганцкага парадку задача сацыялістычнага выхаваньня новых рабочых папаўненьняў і сацыялістычнага перавыхаваньня калгасьнікаў. Аб гэтай задачы нам нельга забываць.

Тав. Сталін вучыў нас: «Прынцып сацыялістычнага спаборніцтва: таварыская дапамога адстаўным з боку перадавых з тым, каб дамагчыся агульнага ўздыму. Канкурэнцыя гаворыць: дабівай адстаўных, каб умацаваць свае панаваньне. Сацыялістычнае спаборніцтва гаворыць: адны працуюць дрэнна, другія добра, трэція лепш—дагоняй лепшых, дамажыся агульнага ўздыму».

А ў нас ёсьць адсталыя вучасткі, якія ня здо лелі на аснове разгорт ваньня сацспаборніцтва ажыцьцяўць 6 гістарычных умоў тав. Сталіна. Рад галін прамысловасьці і рад паасобных прадпрыемстваў адстаюць у нас у выкананьні пляну. У нас рост прадукцыйнасьці працы—«... гэта, у апошнім ліку, самае важнае, самае галоўнае для перамогі новага грамадзтва» (Ленін)—яшчэ адстае ад росту зарплаты. У нас і ў сацыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі ёсьць асобныя адсталыя вучасткі—асобныя адсталыя саўгасы, МТС і калгасы, якія слаба падрыхтаваны да трэцяй бальшавіцкай вясны, якія ня справіліся яшчэ дагэтуль з засыпкай насеньня, з рамонтам і г. д.

Іх трэба падцягнуць, узьняць да ўзроўню перадавых, каб дамагчыся новага, яшчэ больш высокага агульнага ўздыму, каб забясьпечыць выкананьне пляну бягучага году і сваяча совага агульнага прыступу да работы над ажыцьцяўленьнем задач другой пяцігодкі. Вось чаму неабходна на аснове разгорнутай масавай палітычнай работы дамагчыся новага, яшчэ больш магутнага разьвіцьця сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Вось чаму неабходна значна шырэй несьці вопыт спаборніцтва фабрык і заводаў у калгасы, узьнімаючы вытворчы энтузіязм мільёнаў калгаснага сялянства на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, на правільную пабудову калгасных брыгад, на забясьпечаньне пляну весьняной сяўбы, на барацьбу за высокую ўраджайнасьць нашых палёў, сацыялістычна перавыхоўваючы на гэтым шляху калгасьнікаў.

Мы сьвяткуем трэцюю гадавіну сацыялістычнага спаборніцтва ў чацьвёртым заключным годзе пяцігодкі напярэдадні 1 Мая, калі міжнародны пралетарыят будзе праводзіць генэральны агляд сваіх сіл перад новымі рашаючымі баямі з капіталізмам, калі зрокі яго будуць з надзеяй зьвернуты да СССР—яго бацькаўшчыны, да нас—яго перадавой ударнай брыгады. Гэта ўскладае на нас гіганцкую адказнасьць і вялізарныя абавязательствы. Таму нашым лёзунгам у трэцюю гадавіну сацыялістычнага спаборніцтва павінна быць:—новыя мільёны ўдарнікаў—у рады спаборнічаючых! «Праца павінна зрабіцца справай гонару, справай славы, справай адвагі і геройства для кожнага працоўнага нашай краіны».

На надзвычайным зьезьдзе саветаў Койданаўшчыны

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта па тэлефону)

Учора а 6 з паловай гадзін увечары ва ўрачыстых абстаўленнях адкрыўся VII надзвычайны зьезд саветаў Койданаўскага польскага нацыянальнага раёну.

⊙ Зьезд адкрывае старшыня РВК тав. Вансоўскі, пасьля уступнай прамовы якога зьезд абірае прэзыдыум у ліку 36 чалавек, у склад якога абіраюцца т.т. Гікало, Шаранговіч, Жаброўскі, Чарвякоў, Гніляневіч і інш.

⊙ У ганаровы прэзыдыум абіраюцца т.т. Молатаў, Каганові, Калінін, Варашылаў, Арджанікідзе, Андрэеў, Рудзутак, сакратар кампартыі Польшчы тав. Лянскі, тав. Блюхер, старшыня ЦВК УССР т. Пятроўскі.

⊙ Прэзыдыюм абірае ў ганаровы прэзыдыум т. Сталіна зьезд сустракае бурнай авацыяй. Усе прысутнічаючыя ўстаюць.

⊙ Паводле прэзыдыюму дэлегатаў зьезду ў рабочы прэзыдыум зьезду абіраюцца т. Дзяржынская і прадстаўнік ЦК кампартыі Польшчы.

⊙ З прывітаньнем ад ЦК кампартыі Польшчы выступае яго прадстаўнік, даючы яскравую характарыстыку таго ўціску, які аказвае эканамічны брыгіс, ахапіўшы ўсю Польшчу, на шырокія працоўныя масы, характары стыку белага тэрору і імкненьня зьнішчыць рэвалюцыйны рух.

Прадстаўнік ЦК кампартыі Польшчы гаворыць аб вялізарнейшых дасягненьнях сацыялістычнага будаўніцтва БССР. Ён гаворыць аб правільнасьці ленінскай нацыянальнай палітыкі, якую праводзіць партыя і ўрад, і до казам якой зьяўляецца зьезд уноў арганізаванага польскага нацыянальнага раёну.

Посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР і БССР—гаворыць прадстаўнік ЦК кампартыі Польшчы,—надхняюць польскія працоўныя масы на барацьбу з фашызмам і сацыялфашызмам, за савецкую Польшчу.

⊙ Зьезд віталі прадстаўнікі войск пагранічнай аховы, якія рапартавалі аб сваіх дасягненьнях у баявой і палітычнай вучобе.

⊙ Зьездам атрыманы прывітальныя тэлеграмы ад т. Фэлікса Кона, ад Мархлеўскага раёну УССР, ад Гомельскага машынабудаўнічага заводу і інш.

⊙ З вялікім дакладам выступіў старшыня Саўнаркому народных камісараў БССР т. Галадзед.

⊙ На пляцы каля Дому Сацыялістычнай Культуры, у якім праходзіць зьезд, адбыўся вялікі мітынг, прысьвечаны адкрыцьцю зьезду.

⊙ Сёньня на раніцнім паседжаньні абгаворваецца справаздачны даклад тав. Галадзеда.

Гарын.

Старшыня Койданаўскага РВК т. ВАНСОЎСКІ.

Забясьпечыць баявое разгортваньне дарожнага будаўніцтва

(З прамовы сакратара ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО на ўсебеларускай нарадзе па дарожным будаўніцтве)

Ахарактарызаваўшы гаспадарча-палітычную важнасьць дарожнага будаўніцтва тав. Гікало дае падрабязны аналіз становішча з падрыхтоўкай да будаўніцтва.

Калі меркаваць толькі па лічбах,—гаворыць т. Гікало,—дык справа стаіць нібы ня так ужо дрэнна. Заключаны дагаворы на 73 проц. для вырабоўкі рабочых. Каменьня падвезена да месца работ на 66 проц. Супроць мінулага году мы маем вялікія дасягненьні. Але, адна справа, калі гэта запісана на паперы, другая справа ў сапраўднасьці. Вельмі часта калі дакладваюць—малюнак прадстаўляецца бліскучым, а калі праверыць на справе ня зусім так. Паданыя мною ліч бы найбольш блізкія да сапраўднасьці, аднак трэба кожнаму з вас і нам таксама праверыць ці ўсё гэта так, ці няма тут перавялічэньня, ці няма тут вчкаўціраецьства, трэба праверыць ці замацавана гэтая работа.

Дрэнна з грэйдэрам і пяском. Зататавана ўсяго 6-10 проц. пляну. Гэта паказвае, што неабходных тэмпаў у гэтай рабоце няма.

Далей тав. Гікало завастрае ўвагу нарады на пытаньні асваеньня мэханізмаў і іх скарыстаньня, з чым у нас справа пастаўлена далёка не на належную вышыню. Так, на 5 дарбудвучастку камнядрабілкі выкарыстоўваюцца толькі на 50-60 проц., прычым прадукцыйнасьць працуючых машын не перавышае 50 проц.

Такое недапушчальнае становішча з выкарыстаньнем мэханізмаў тлумачыцца перш за ўсё адсутнасьцю належнай работы па асваеньні іх, па аўладаньні тэхнікай.

У бягучым годзе,—гаворыць т. Гікало—мэханізмы павінны быць скарыстаны на 100 проц. Гэтая справа ўпіраецца ў пытаньні забясьпечаньня дарвучасткаў кваліфікаванай рабочай сілай, падняцьця кваліфікацыі, тых што стаяць ля машын, у правільнай арганізацыі сыстэмы заработнай платы.

Каб дасягнуць неабходнага эфэкту ў скарыстаньні машын, мэханізмаў, рабочай сілы, матар'ялаў, мы павінны на справе рэалізаваць 6 гістарычных пакаданьняў тав. Сталіна.

Вялікае значэньне для забясьпечэньня поўнага выкананьня пляну мае па станоўка рабочага снабжэньня. Тут трэба сказаць, што дарожнікі па частцы снабжэньня знаходзяцца ня ў дрэнным становішчы, у параўнаньні з іншымі будаўнічымі групамі рабочых. Пытаньне заключаецца ў тым, каб правільна скарыстаць тое, што адпускаецца, каб той паёк, той харч, які адпускаецца рабочаму, дзе небудзь не застаўся, каб дайшоў да рабочага паўна цэнным пайком. Трэба зьвярнуць увагу на якасьць грамадзкага харчаваньня. Можна адпусьціць многа прадуктаў, але калі іх дрэнна прыгатаваць, дык—грош цана ўсім гэтым прадуктам. Трэба таксама скарыстаць усяліякія мясцовыя рэсурсы для павялічэньня фонду снабжэньня. Трэба ў гэтым пытаньні праяўляць ініцыятыву.

Вялікае значэньне мае таксама пытаньне разьмяшчэньня рабочай сілы. Трэба дабіцца добрага абсталяваньня баракаў, чыстаты ў іх, культурнага абслугоўваньня. Гэта важнейшая задача камуністаў-дарожнікаў.

Зусім відавочна, што тыя задачы, якія стаяць перад намі для выкананьня пляну дарожнага будаўніцтва немагчыма вырашыць без разгортваньня партыйна-масавай работы. Зусім невыпадкова пастаўлены ва ўсю шырыню на гэтай нарадзе пытаньні партыйна-масавай работы. Рад спраў паказвае, што там, дзе партыйна-масавая работа не разгорнута, ёсьць многа недахопаў, там уся работа ідзе слаба. Лепшым за казам гэтага зьяўляецца прыклад усім вядомай зембінскай справы. За пастаноўку партыйна-масавай работы павінны адказваць партарганізатары, сакратары партыйных ячэек. Гэтага мы будзем патрабаваць з усёй рашучасьцю.

Мы патрабуем ад кожнага камуніста, кожнага партработніка дарожнага будаўніцтва бальшавіцкай барацьбы за выкананьне пляну. Мы не дапусьцім ніякай расхлябанасьці, ніякага паслабленьня работы. Трэба вытрыць разважаньні аб тым, што вось, мол, у нас атрымаўся прарыў, але мы яго як небудзь папіханьку выправім. Трэба па-бальшавіцку, моцна, не баючыся, ставіць пытаньні, зьвязаныя з забясьпячэньнем выкананьня пляну. У пытаньнях барацьбы за сацыялістычнае будаўніцтва, за абарону краіны, за інтарэсы рабочае клясы, за бытавое абслугоўваньне яго бальшавік павінен на любым вучастку біцца так, як гэта прыстойна бальшавіку. Ня можа быць ніякіх спасыланьняў на тое, што вось я-б сказаў, але баюся, што Янка Міхасёў абразіцца, я-б сыгналізаваў, але баюся, што сакратар адпаведнага парткому абразіцца, я-б паставіў пытаньне, але баюся, што можа там адпаведны кіраўнік ці загадчык абразіцца. Гэтага не павінна быць таму, што калі мы будзем так правадзіць, мы ня вырашым тых задач, якія перад намі паставіла партыя.

Задача заключаецца ў тым, каб больш бываць на мясцох, ахапіць важнейшыя вучасткі работы, апэрацыйна кіраваць, выпраўляць недахопы, дапамагаць у выпраўленьні іх і г. д. Абавязак кожнага камуніста паведамляць аб тым, што робіцца на мясцох.

Дзе-ні-дзе чуцны галасы аб перэальнасьці пляну. Гэта галасы апартуністаў. Тое, што партыя намячае магчыма для выкананьня. У гэтым мы перамаглі хоць-бы на вопыце выкананьня пляну лесазагатовак. Я памятаю, як некаторыя работнікі даводзілі, што плян лесазагатовак немагчымы для выкананьня. Аднак, калі мы рашуча паставілі пытаньне, калі мы прымусілі сапраўды, закасаўшы рукавы, па-бальшавіцку ўзяцца за работу, плян аказаўся магчымым да выкананьня. То-еж самае і ў пытаньні дарожнага будаўніцтва. Плян зусім рэальны. Уся справа ў тым, каб з бальшавіцкай упартасьцю ўзяцца за яго выкананьне.

Важнейшай умовай выкананьня пляну зьяўляецца ў першую чаргу рэалізацыя 6 умоў тав. Сталіна. У гэтым гвоздь пытаньня. Без гэтага наогул нельга працаваць.

Пара перабудаваць. Па-новаму працаваць—гэта значыцца менш пісаць рэзалюцый, часьцей бываць на мясцох, у масе, кіраваць апэрацыйна. І Цэнтральнаму Камітэту ў гэтых адносінах трэба яшчэ многа чаго зрабіць. На важнейшыя вучасткі дарожнага будаўніцтва гаксама, як на пасеўны, торфараспрацоўкі і т. д. павінны быць кінуты лепшыя сілы, павінна быць забясьпечаны штодзенны апэратыўны нагляд.

Канчаючы сваё выступленьне, тав. Гікало заклікаў удзельнікаў нарады забясьпечыць баявое разгортваньне дарожнага будаўніцтва з тым, каб на аснове 6 умоў тав. Сталіна поўнасьцю выканаць намечаны плян. Мы гэта можам зрабіць—гаворыць т. Гікало,—абавязаны і бязумоўна зробім.

СТАНОВІШЧА НА КІТАЙСКА-УСХОДНЯЙ ЧЫГУНЦЫ

На паўднёвай лініі рух перарваны

БЭЙПІН, 23. (ТАСС). Сёньня, у сувязі з заняцьцем партызанскімі атрадамі станцыі Санчахэ, на паўднёвай лініі КУЧ рух перарваны. Японскія салдаты бамбардыруюць партызанскія атрады. На ўсходняй лініі КУЧ рух усё яшчэ не адноўлен у сувязі з ваеннымі дзеньнямі, якія працягваюцца. Тэлеграфная сувязь з Усходняй лініяй і Уладывастокам перарвана.

БЭЙПІН, 23. (ТАСС). Як паведамляюць з Харбіна, 23 красавіка кітайскай аховай і агентамі КУЧ выяўлена спроба выбуху моста праз рэчку Муданьцзянь на ўсходняй лініі КУЧ. Затрыманы два кітайцы.

Напад харбінскіх белагвардзейцаў на савецкіх грамадзян

БЭЙПІН, 23. (ТАСС). Паводле паведамленьня з Харбіна, у апошнія дні групамі белагвардзейскай моладзі зьбіты 2 супрацоўнікі камандыры савецкага консульства і зроблен напад на кватэру служачых КУЧ. Савецкі генэральны пасол у Харбіне т. СЛАВУЦКІ заявіў пратэст уладам, указаўшы, што прынятыя мер у адносінах да выпадкаў бясчынства і самавольства белагвардзейцаў, якія ўжо адзначаны, ствараюць спрыяючыя абставіны для далейшых такіх-жа зьяўлеьняў. Так. Славуцкі патрабаваў самага строгага расьследваньня і прыняцьця адпаведных мер.

Японцы падвозяць войска

БЭРЛІН, 25. (ТАСС). Паводле паведамленьня агенцтва Вольф, 39-я японская брыгада пад камандай генэрала Камура прыбыла з Токіё ў Чань чунь. Брыгада разьмешчана часткова ў Гірыне, часткова—у Тунхуа і Харбіне.

Ствараецца пагроза новых грандыёзных войнаў

ЛЕНДАН. Газэта «Манчэсьцер Гардыян» заяўляе, што становішча на Далёкім Усходзе робіцца ўсё больш сур'ёзным. Газэта зазначае, што ўстрымліваючыся ад ужываньня свайго статуту Ліга нацый грае на руку японскім імпэрыялістам, а дзяржавы праводзяць такую палітыку, якая сьведчыць што імпэрыялістычная агрэсія пэ ранейшаму магчыма.

Паводле слоў газэты, Японія працягвае праводзіць актыўную палітыку ў Манчжурыі, у сувязі з тым, стараецца становішча, пагражаючае новымі грандыёзнымі войнамі.

***

ТОКІЁ. Сімбун Рэнга паведамляе з Чанчуня, што манчжурская ўлада пасылае палітыйскіх для навучаньня ў Такійскую палітыйскую школу.

Польсція імпэрыялісты падтрымліваюць Японію

ВАРШАВА. Афіцыйныя польскія колы ўсімі сіламі стараюцца забясьпечыць сімпатыі грамадзкасьці японскаму імпэрыялізму. Усьлед за артыкуламі ў газэтах урэдавага блёку, дзе выказваецца «японскі нацыфізм» 25 красавіка наладжаны даклад супрацоўніка японскага пасольства доктара Умэда на тэму «Японія ў канфлікце на Далёкім Усходзе». Умэда старанна даводзіў, што Японія ня мае агрэсыўных намераў.

Вялікай нечаканасьцю для арганізатараў даклада зьявіліся бурныя пратэсты групы моладзі.

Нанкінскі урад адмовіцца

ТОКІЁ. 27-4. Паводле паведамленьня агенцтва Сімбун Рэнго з Шанхаю, у колах японскай дэлегацыі спадзяюцца, што японска-кітайскія перагаворы адновяцца не раней 30 красавіка. Згодна ўсіх даных нанкінскі ўрад згодзіцца адмовіцца ад патрабаваньня дакладнай фіксацыі тэрміну вываду японскага войска.

Пратэст савецкага генэральнага консула

БЭЙПІН. 23. (ТАСС). Як паведамляюць з Харбіна, савецкі генэральны консул тав. Славуцкі 20 красавіка заявіў начальніку дыпляматычнага кіраўніцтва ў Харбіне адносна паведамленьня аб спыненьні выдачы віз савецкім грамадзянам на выезд у СССР. Тав. Славуцкі падкрэсьліў, што гэтае мерапрыемства накіравана супроць СССР і выклікае энэргічны пратэст.

Сёньня начальнік дыпляматычнага кіраўніцтва Шы ў інтэрв'ю з прадстаўнікамі газэт адзначыў, што ніякіх рэпрэсіраваньняў па гэтым пытаньні афіцыйнымі ўладамі зроблена ня было. У сувязі з гэтай заявай робіцца зусім зразумелым, што забарона выезду была ўведзена на распараджэньні японскіх дарадцаў. Сёньня выдача віз была адноўлена.

ЗЬЛЕВА НАПРАВА: 1. ГЕЛЬФАНД БЛ., інспэктар Гараховыздароўя г. Віцебску, актыўны ўдзельнік сацспаборніцтва па Чырвонай кнізе. 2. ПЛЕЎСКАЯ Г. В., работніца-ўдарніца з 17-гадовым вытворчым стажам, нам. старшыні дэпутацкай групы шэйнай фабрыкі г. Бабруйску, член прэзыдыуму гарсавету. 3. СКУЛОВІЧ—рабочы-ўдарнік вытворчы стаж 32 гады, актывіст Віцебскага гарсавету. 4. СУСЭР У. М., рабочы-ўдарнік шэйнай фабрыкі імя Дзяржынскага, рабочы стаж 28 год, сацсумяшчальнік сельгас-камбінату, старшыня сэкцыі прыгарадной гаспадаркі Бабруйскага гарсавету. 5. ГАМЗЮК У. М., рабочы-ўдарнік станкавы камбінату, рабочы стаж 19 год, сацсумяшчальнік жыллёвага інспэктара. 6. КАЗЛОЎ СЬЦЯПАН,6, старшыня Селічаўскага сельсавету, Касьцюковіцкага раёну—пераможца сельсавету ў спаборніцтве па Чырвонай кнізе саветаў. 7. НАЎМЕНКА К. А., старшыня Селічаўскага сельсавету. 8. ІТЭЛЬСОН, работніца-ўдарніца, старшыня дэпутацкай групы фабрыкі «Прафінтэрн».

САВЕЦКІ САЮЗ І ТУРЦЫЯ

Сёньня прыбывае ў Маскву прэм'ер-міністр турэцкай рэспублікі Ісмэт-Паша.

Прэм'ер-міністра суправаджаюць міністр замежных спраў Тэфік Рушшю Бэй, генэральны сакратар народнарэспубліканскай партыі Рэджэд-Бэй і іншыя выдатнейшыя дзяржаўныя, грамадзкія і навуковыя дзеячы сучаснай Турцыі.

Гэты візыт галавы і членаў турэцкага ўраду і прадстаўнікоў парляманту Савецкаму Саюзу ні ў якай ступені ня можа быць утоесамлены з тымі візытамі, якія так звычайны ў практыцы адносін паміж імпэрыялістычнымі дзяржавамі. Візыты імпэрыялістаў зьяўляюцца этапамі на шляху падрыхтоўкі новай сусьветнай вайны і нападзеньня на Савецкі Саюз. Спатканьне-ж дзяржаўных дзеячоў Савецкага Саюзу і Турцыі прасьледуюць мэту ўзмацненьня і разьвіцьця дружаскіх адносін паміж іх краінамі і зьяўляюцца этапамі на шляху барацьбы за мір.

Гэты візыт прэм'ер-міністра Турэцкай рэспублікі ў Маскву выкліканы не якой небудзь выпадковай кампазыцыяй сіл, абумоўленай міжнародняй сітуацыяй сёньняшняга дня, а лёгічна вынікае з усёй папярэдняй гісторыі новай Турцыі і яе адносін з Савецкім саюзам.

Калі пасьля прыняцьця султанскім ўрадам ганебнага Сэўрскага дагавору, адзначынага канец незалежнасьці нацыянальнага існаваньня Турцыі, на барацьбу з імпэрыялістычнымі прыпнетальнікамі ўзьнялася сялянская Анатолія, тады адзінай сілай, якая прыйшла на дапамогу турэцкаму народу, былі савецкія рэспублікі, якія ўтварыліся на тэрыторыі былой царскай Расіі.

Гэтыя рэспублікі таксама адстойвалі ў той час сваё існаваньне ад шалёнага нацыску міжнароднага імпэрыялізму. Царскі рэжым у Расіі і султанскі рэжым у Турцыі былі прыхвасьнямі чужаземнага капіталу. Пралетарскай рэвалюцыі ў Расіі з першага-ж дню прыйшлося адбіваць атакі міжнароднага імпэрыялізму, якія ня спыняліся. Таксама нацыянальная рэвалюцыі ў Турцыі прыйшлося вытрымаць не адну шалёную атаку міжнароднага капіталу. Таму, ня гледзячы на розьніцу сацыяльных укладаў, савецкія рэспублікі і новая Турцыя правільна наменцілі і цьвёрда праводзілі ў жыцьцё лінію свайго супрацоўніцтва ў галіне замежняй палітыкі. Гэта лінія барацьбы за права і магчымасьці незалежнага ўнутранага будаўніцтва. Перад пралетарыятам Савецкага Саюзу, які ўзяў у свае рукі ўладу, стаяла вялізарная задача аднаўленьня разбуранай імпэрыялістычнай і грамадзянскай войнамі народнай гаспадаркі і рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі на сацыялістычных пачатках.

Палітыка няўмяшаньня ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў і ня ўдзел у якіх там ня было групоўках міжнароднага характару, якія на самой сваёй прыродзе прыводзяць да ваенных сутычак, выцяклі з самой сутнасьці тых задач, якія паставіла перад працоўнымі Савецкага саюзу Кастрычніцкая рэвалюцыя. Перад маладой Турэцкай рэспублікай стаялі задачы аднаўленьня і разьвіцьця ў новых умовах сваёй народнай гаспадаркі, а таксама задачы па правядзеньні ряду важнейшых рэформ на ўсіх галінах палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцьця краіны.

Вырашэньне гэтых задач зьяўлялася неабходнай умовай замацаваньня і далейшага разьвіцьця заваёвы нацыянальнай рэвалюцыі ў Турцыі. Турэцкая рэспубліка, як і Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, імкнулася таму да забясьпечаньня мірных умоў для свайго разьвіцьця. Міжнародны імпэрыялізм, які разьдзіраецца ўнутранымі супярэчнасьцямі, што асабліва ва абастрылося пад уплывам сусьветнага эканамічнага крызісу, ня можа прымірыцца з новымі міжнароднымі абставінамі, якія склаліся ў выніку стварэньня на адзінай шостай частцы зямное кулі — краіны, якая будуе сацыялізм. Узьнікненьне на важнейшых сусьветных стратэгічных шляхох нацыянальна - незалежнай Турцыі зьявілася буйнейшай перашкодай для ажыцьцяўленьня планаў імпэрыялістычных дзяржаў.

У пасьляваенны пэрыяд імпэрыялізм стварыў новыя групоўкі ваеннага характару, накіраваныя супроць Савецкага Саюзу і супроць нацыянальна - незалежных дзяржаў Усходу. Імпэрыялісты ставяць сабе такую задачу, якую яны ніколі ня могуць вырашыць. Яны імкнуцца парваць натуральную сувязь паміж пралетарскімі рэвалюцыямі на Захадзе і нацыянальна - вызваленчай барацьбой на Усходзе. Для гэтага яны перш за ўсё імкнуцца сарваць савецка - турэцкую дружбу. Скарыстоўваючы цяжкае, у выніку сусьветнага крызісу, становішча Турцыі, імпэрыялісты розьнымі сіламі і абяцаньнямі спрабуюць уключыць яе ў свае групоўкі. Імпэрыялістычная дыпляматыя, зразумеўшы рэч, правільна разьлічвае, што з Турцыяй, якая не падтрымлівае дружаскіх адносін з Савецкім Саюзам, можа будзе гутарыць інакш і можна будзе дыктаваць ёй тады сваю волю і навязаць свае планы. Але ўсе ўжытыя ў гэтым напрамку крокі, не давалі пажаданых для імпэрыялістычных заправіл вынікаў.

Зацікаўленыя ў захаваньні міру абедзьве краіны — Савецкі Саюз і Турцыя — проціпастаўлялі імпэрыялісцкай палітыцы груповак палітыку дагавораў аб нэйтралітэце, ненападзеньні і ўдзелу ў варожых для другой краіны групоўках. Першым да такога такога тыпу быў савецка-турэцкі пакт 1925 г. аб нэйтралітэце і ненападзеньні. У сьнежні 1929 г. у Анкары быў падпісаны тав. Караханам і Тэфік Рушшю-Бэем савецкі пракакол, які ня толькі працягнуў дзейчаньне парыскага пакту, але і пашырыў дзейчаньне апошняга, усклаўшы на бакі абавязацельства на весьці перагаворы з суседзямі іншай краіны і не заключаць з імі згоды без згод другога боку. Савецка-турэцкі пакт быў адноўлены на новы тэрмін у часе візіту тав. Літвінава ў Анкары 1930 г. Гэтая палітыка паказала сваю жыцьцяздольнасьць як зброя забясьпячэньня міру.

Турцыя ў мінулы пэрыяд адбіла пад кіраўніцтвам свайго прэзыдэнта Газі Мустафы Кемаля і прэм'ер - міністра Ісмэт Пашы ўсе націскі замежнага капіталу, разгрэміла рэшткі сумтанскай і халіфацкай контррэвалюцыі, правяла аддзяленьне царкоўны ад дзяржавы і абапіраючыся на свае ўнутраныя рэсурсы, пасьляхова разьвівае сваю народную гаспадарку.

У сучасны момант міжнародныя абставіны зьяўляюцца асабліва трывожнымі. Патрэбіз напружаная пільнасьць для захаваньня міру. Вялікае значэньне ў гэтым м

ВЫШЭЙ СЬЦЯГІ ЛЕНІНСКАГА СПАБОРНІЦТВА

Мільённыя масы працоўных Савецкага Саюзу змагаюцца за канчатковую пабудову бясклясавага грамадзтва.

Яшчэ з большай настойлівасьцю ажыцьцяўляць шэсьць гістарычных умоў тав. Сталіна

За трэці конкурс спараных

Падтрымаць ініцыятыву паравозу Щ-1689

Ліст да шэфа—рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь"

Сёньня рабочая кляса і працоўнае сялянства ўсяго Савецкага Саюзу пад водзяць балыя вынікі 3-й гадавіны сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі за гэтыя тры гады надзвычай шырока разьвіліся мэтады сацыялістычнай работы. Заводы і фабрыкі прыйшлі да 3-й гадавіны з сотнямі ўзорных гаспадарча-разьліковых брыгад, з арміяй ударнікаў, якія паказваюць прыклады таго, як па-сапраўднаму, па-бальшавіцку трэба змагацца за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

Паравозьнікі ўсяго Савецкага Саюзу сустрэлі 3-ю гадавіну сацыялістычнага спаборніцтва бліскучымі вынікамі другога ўсесаюзнага конкурсу лепшых спараных брыгад. Конкурс паказаў такія спараныя брыгады, па якіх у далейшым будуць раўняцца ўсе паравозьнікі СССР. У выніку разгорнутай работы многія дэпо дасягнулі адчувальнага аздараўленьня паравознай гаспадаркі—гэтага галоўнага нэрву сацыялістычнага транспарту.

Посьпехі другога Ўсесаюзнага конкурсу лепшых спараных брыгад дасягнуты ў сацыялістычным спаборніцтве, у барацьбе за здаровы транспарт. Той факт, што спаборніцтва трохсот васьмі было ператворана ў масавае спаборніцтва ўсіх брыгад, сьведчыць аб найвялікшым уздыме сацыялістычнага спаборніцтва сярод паравозьнікаў. **Усе чыгуначныя дарогі змагаліся за сьцяг «Правды», кожная паравозная адзінка змагалася за сваё пяршынства, за пяршынства свайго дэпо, за пяршынства сваёй дарогі.**

Спаборніцтва было перанесена ў спараныя брыгады. Спараныя брыгады нашага паравозу Щ-1689 перайшлі на гаспадарчы разьлік і дагаворы, заключаныя з гаспадарнікамі, фактычна былі дагаворамі спаборніцтва паміж брыгадамі паравозу.

Што дало спаборніцтва на нашым паравозе?

Пачнем з паліва. У часе першага конкурсу мы дасягнулі 42 проц. эканоміі. Гэта быў усесаюзны рэкорд. У другім конкурсе мы дасягнулі 30 пр. эканоміі і—значыцца—ня здолелі перакрыць посьпехаў першага. У даным выпадку нельга забываць аб новым паравозе, які быў атрыманы намі толькі пасьля 10 дзён ад пачатку конкурсу. Спачатку мы ня ведалі свайго паравоза і давалі... пераш. Мы разгарнулі спаборніцтва на вывучэньні паравозу. І першыя тры дні далі 5 проц. эканоміі, далей эканомія прагрэсыўна расла.

Дэпо ў цэлым за апошні месяц конкурсу дамаглося 14 проц. эканоміі паліва. Таму, далейшую барацьбу за эканомію паліва трэба асабліва перанесьці ў нізавое зьвяно, у спараную брыгаду, у партыйную і прафсаюзную групы.

Нашы брыгады першыя перайшлі на гаспадарчы разьлік і, настойліва ажыцьцяўляючы яго, выконралі гэтым самым адну з умоў тав. Сталіна. Сапраўдны разрахунак на нашым паравозе прывёў да аздараўленьня паравозу, да павялічэньня яго карыснай работы, да павялічэньня заработку спараных брыгад.

Аднак, за час другога Ўсесаюзнага конкурсу яшчэ нямат чаго ня зроблена. Так, абязьлічка больш за ўсё яшчэ наглядаецца ў рамонце. Запягнуты і недобраякасны рамонт выбівае са строю паравозы, адбіваецца на работе ўсяго дэпо. У работу ўсяго дэпо і ў асаблівасьці брыгад слаба ўкараняецца зьменна-сустрэчнае плянаваньне, не арганізавана работа паліваўых складаў і ўсіх астатніх зьвеньняў, якія непасрэдна зьвязаны з работай дэпо. Яшчэ слаба настаўлена аўладаньне тэхнікай, ёсьць шмат іншых недахопаў.

Надыходзіць надзвычай адказны этап работы транспарту—асеньня-зімовыя перавозкі. Ніхто ня будзе так наіўным, каб гаварыць, што пры наяўнасьці гэтых недахопаў мы з посьпехам выканаем плян асеньня-зімовых перавозак.

Мы падтрымліваем прапанову Сакольніцкага райкому камсамолу і настойваем перад адпаведнымі органамі аб арганізацыі трэцяга ўсесаюзнага конкурсу лепшых спараных брыгад.

Лічачы, што ініцыятыва лепшых паравозьнікаў аб арганізацыі **3-га конкурсу імя Першага Мая будзе падтрымана ўсімі чыгуначнікамі, для сваіх спараных брыгад паравозу Щ-1689 сёнешні дзень мы абвяшчаем днём старту падрыхтоўчай работы да конкурсу.**

Падрыхтоўчая работа да конкурсу, па нашай думцы, павінна весьціся на працягу ўсяго мая, які абвешчаны месячнікам зьменна-сустрэчнага плянаваньня. Упор у падрыхтоўчай рабоце павінен рабіцца менавіта на зьменна-сустрэчнае плянаваньне ў нізавым зьвяне, у брыгадзе, на пераход на гаспадарчы разьлік абсалютна ўсіх брыгад.

Посьпех конкурсу вырашыць масавая падрыхтоўка да яго і тое, наколькі ў падрыхтоўчую работу будуць уцягнуты ўсе арганізацыі і ўсе чыгуначнікі.

Ясным застаецца адно, што па-за трэцім конкурсам спараных брыгад не павінен застацца ні адзін паравозьнік, ні адзін чыгуначнік, бо справа аздараўленьня паравознай гаспадаркі і бальшавіцкая сустрэча асеньня-зімовых перавозак—справа гонару кожнага чыгуначніка, кожнага рабочага.

Мы зьвяртаемся да ўсіх паравозьнікаў і чыгуначнікаў Заходніх і МБЖ чыгунак з просьбай падтрымаць нашу прапанову аб 3-м Усесаюзным конкурсе лепшых спараных брыгад і прыступіць да практычнага выраішэньня правядзеньня яго.

Мы зьвяртаемся да свайго шэфа—газэты «Савецкая Беларусь»—з просьбай давесьці нашу прапанову да ведама ўсіх чыгуначнікаў і ўключыць іх у падрыхтоўку і правядзеньне конкурсу.

3-ю гадавіну сацыялістычнага спаборніцтва і пралетарскае сьвята Першае Мая мы адзначым новымі посьпехамі і перамогамі ў аздараўленьні паравознай гаспадаркі. Сацыялістычнае спаборніцтва ўсіх спараных брыгад павінна яшчэ больш узьняць тэмпы сацыялістычнай рэканструкцыі транспарту, тэмпы аздараўленьня паравознага парку.

Усе сілы і намаганьні пакласьці на тое, каб адказнейшы палітычны экзамін—асеньня-зімовыя перавозкі—транспарт сустрэў у баявой гатоўнасьці і па-баявому вытрымаў-бы яго.

Ленінскае сацыялістычнае спаборніцтва ўзьнімем на яшчэ большую вышыню. Гэтага вымагаюць задачы сацыялістычнай рэканструкцыі транспарту. Гэтага вымагае ажыцьцяўленьне пастаноў партыі і ўраду аб рабоце транспарту і загад тав. Андрэева.

Спараныя брыгады ўдарнага паравозу імя газ. «Сав. Бел.» (дэпо Жлобін) — машыністаў Зялёнкі і Хохава.

УДАРНАЙ РАБОТАЙ—СУСТРЭНЕМ ТРЭЦЬЮ ГАДАВІНУ

БАРЫСАЎ.

На камбінаце «Камінтэрн» за час разгорнутай падрыхтоўчай работы да 3-й гадавіны сацыяборніцтва арганізавана 9 новых гаспадарча-разьліковых брыгад імя Першага мая, IX зьезду прафсаюзаў і 3-й гадавіны спаборніцтва. Ёсьць значны зрух у выкананьні прамфінпляну: за 3-ю пяцідзёнку красавіка прамфінплян на калодачным цэху выкананы на 121,5 проц., на фанэрным—на 100,4 проц.

Б.

МЕНСК.

На абутковай фабрыцы падрыхтоўка да першамайскіх сьвят і 3-й гадавіны спаборніцтва праходзіла пад знакам мабілізацыі рабочых на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну 4-га заключнага году пяцігодкі. Рабочыя высунулі сустрэчныя прамфінпляны, узялі на сябе абавязкі па палепшаньні якасьці прадукцыі, аўладаньні тэхнікай і ліквідацыі абязьлічкі.

Арганізавана 5 новых гаспадарча-разьліковых брыгад. Бюро рацыяналізацыі праведзена эстафэта на зборы рабочых прапаноў.

Зык.

ВІЦЕБСК.

За 3-ю пяцідзёнку красавіка фабрыка «Дзьвіна» павінна была выпрацаваць паводле пляну 36,520 тон прадзіва. Фактычная выпрацоўка складае 37,334 тоны. Замест 522,720 тона-нумароў паводле пляну, выпрацавана 561,697 тона-нумароў, што складае 104,45 проц. выкананьня прамфінпляну.

Да 17 красавіка прамфінплян на фабрыцы быў выкананы на 108 проц.

Па—кі.

ГОМЕЛЬ.

На дрэваапрацоўчым камбінаце праводзіўся масавы агляд сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Рабочыя і ІТР камбінату ўзялі на сябе рад абавязкаў па выкананьні прамфінпляну, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на выкананьне экспартнай праграмы.

Праведзена работа па даабсталяваньні многіх цэхаў і скончаны рад дапаможных [illegible] на тэрыторыі камбінату.

Х.

Сьлесар-ударнік заводу імя Варашылава тав. Дрозьнін.

ІТР БССР РЭАЛІЗУЮЦЬ УКАЗАНЬНІ тав. СТАЛІНА

Уже мінула гадавіна з часу гістарычнага выступленьня тав. Сталіна на нарадзе аб аўладаньні тэхнікай. Недалёка гадавіна другога гістарычнага выступленьня правадыра рабочае кляскі аб новай абстаноўцы і новых задачах, алрымаўшага ўсім вядомую назву «шасьці ўмоў тав. Сталіна». У гэтых шасьці ўмовах—даўно прысьвечаны інжынэрна-тэхнічнай інтэлігенцыі, прычым асабліва падкрэслена неабходнасьць стварэньня адпаведнай абстаноўкі для карыснай работы спэцыялістаў.

Усьлед за выступленьнем тав. Сталіна пасьледвалі ліпеньская настанова ЦК УсесКП(б) і жлівеньскі дэкрэт ЦВК і СНК СССР аб прыцягненьні інжынэрна-тэхнічных работнікаў у снабжэньні да індустрыяльных рабочых. Гэтым падводзілася матар'яльная база пад той уздым актыўнасьці ІТР, які мы наглядалі ў выніку выступленьняў тав. Сталіна.

Агульны ўздым актыўнасьці інжынэрна-тэхнічнай масы знайшоў свой выраз і ў нас у БССР.

У чым канкрэтна мы наглядаем зрухі ў аспродзьдзі ІТР нашай рэспублікі? Аснoўнае—гэта тое, што інжынэрна - тэхнічныя работнікі ў масе сваёй перасталі быць «вузкімі» спэцыялістамі: інжынэрамі, тэхнікамі, агранамамі і г. д., а сталі актыўнымі ўдзельнікамі тых многагранных форм нашай сацыялістычнай працы.

Інжынэрна-тэхнічная маса, заражаная энтузіязмам рабочае кляскі, разам з якой ёй прыходзіцца працаваць, стаўшы ісьці ў нагу, з ёю і заваяваць назву тэхнічных камандзіраў вытворчасьці, якую яна раней насіла фармальна.

Спэцыяліст тэхнік, ударнік тав. Айзман.

Вынікам гэтага ўздыму ў аспродзьдзі ІТР зьявілася тое, што мы зараз маем кандыдатаў (праўда, невялікую колькасьць) на дошку гонару ІТР.

Да іх належаць работнікі з вытворчасьці і з навукова-дасьледчых інстытутаў. **Тут сьледуе назваць імёны т.т. Няўзорава і Шэфэра**—(работнікі 2-га участку Зах. чыгункі), **Сэнцюрына, Муйкаціна, Алізарэвіча** (работнікі 8-га будвучастку), **Трафімава** (таксама чыгунка) і **Цыпэровіча** (інстытут прамысловасьці ВСНГ).

Няўзораў і Шэфэр (першы ў якасьці начальніка вучастку, другі—тэхніка дэпо) забясьпечылі сьвячасовы пуск у эксплёатацыю лініі Магілёў-Раслаўль у тэрмін, вызначаны партыяй і ўрадам.

Сэнцюрын, Мушкацін, Алізарэвіч і інш. іх таварышы дэтэрмінова выканалі аспоўныя работы па пабудове Бабруйскай лініі.

Тав. Цыпэровіч працуе над праблемай спальваньня торфу-фрэзэра і дасягнуў значных посьпехаў.

Дзьве трэці ўсёй масы ІТР БССР—у радох ударнікаў, прычым у некаторых галінах вытворчасьці гэтая лічба даходзіць да 100 проц. (напрыклад па паліграфічнай прамысловасьці).

Паказьнікам творчага ўздыму ў аспродзьдзі ІТР служыць бязумоўна водгук спэцыялістаў БССР на лёзунг зунгу, кінутага ў масы рабочых, ІТР і калгасьнікаў год таму назад тав. Сталіным.

Лепшы машыніст тав. Зялёнка паравоза імя газэты «Савецкая Беларусь».



Ударнік рэйкоўшчык зав. «Бальшавік» Драгілеў.

Барацьба за аўладаньне тэхнікай выяўляецца ростам гурткоў на прадпрыемствах, будоўлях і ў саўгасах, у якіх ІТР зьяўляюцца лектарамі і кіраўнікамі. Гэтых гурткоў у БССР налічваецца мноства. У іх маса рабочых і калгасьнікаў ліквідуе сваю тэхнічную няпісьменнасьць і авалодвае навукай і тэхнікай. У Менску па 26 прадпрыемствах ахоплена тэхвучобай каля 4 тысяч чалавек, у Магілёве—1950 чал., Віцебску—1800 чал. Воршы—2100 чал.

Спэцыялісты сельскай гаспадаркі сваёй работе па перадачы тэхнічных ведаў рабочым вёскі і калгасьнікам надалі форму выпуску пазыкі «тэхніка масам», аблігацыі якой у колькасьці 2500 шт. па 60 гадзін атрымалі распаўсюджаньне сярод спэцыялістаў (лектараў) і рабочых і калгасьнікаў (слухачоў). Гэтую форму абмену тэхнічнымі ведамі трэба ўсяляк падахвочваць, паколькі яна заключае ў сябе момант дабраахвотна ўзятых на сябе бакамі абавязацельстваў.

ІТР БССР наблізіліся да таго, каб стаць сапраўднымі тэхнічнымі камандзірамі вытворчасьці.

Д. Кулькін.

У фонд эканамічнай незалежнасьці

Побач з задачай выкананьня і перавыкананьня плянаў па экспартнай прадукцыі, перад заводам імя Домбаля (Магілёў) пастаўлена яшчэ адна важнейшая задача—выпрацоўка асобных дэталяў імпартнага абсталяваньня для прадпрыемстваў БССР.

Магілёўская фабрыка штучнага валакна дагэтуль набывала з-за мяжы цэлы рад тэхнічнага абсталяваньня. Цяпер значная колькасьць іх, як на прыклад, гнутыя і вуглавыя ніцеваздзіцелі, трубкі для матальных машын, дрот для «чарвякоў» і галеты вырабляюцца на заводзе імя Домбаля.

У гонар трэцяй гадавіны сацыялістычнага спаборніцтва на заводзе праводзіліся іспыты па апрацоўцы шкляных камутатараў, якія павінны замяніць камутатары імпартныя. Іспыты далі добрыя вынікі. У бліжэйшы час завод пачне масавы выраб шкляных камутатараў, чым зробіць каштоўны ўклад у фонд тэхніка-эканамічнай незалежнасьці СССР.

Т-с.



1. НА ЗДЫМКУ: 1) ДРЭС імя Сталіна. 2) Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат, цэх стандартных дамоў. 3) Электраманцёр заводу імя Варашылава ударнік тав. Шпакоўскі. 4) Выраб камен ядрабілак для чорнай мэталюргіі на заводзе імя Варашылава. 5) Віцебская панчошная фабрыка. 6) Клюб мэталістаў у Віцебску. 7) Цыклозавод у Кась [illegible]

П. Шастакоў

Насустрач сонцу!

Спадарожнікі ў мінуўшчыну

«Молитву тихую шептали
И пели песни старины»...
(Лермонтов).

З бярозавымі кійкамі, з гутаркамі лісьлівымі, з думкамі патаемнымі вандравалі тут «вучоныя» мужы—попы былы Красінскі ды «географ» Азбукін.

Азіралі «вучоныя» мужы вотчыны былых князёў беларускіх, вывучалі, вынаходзілі старыя заімшэлыя шляхі мінулага, вешкі ставілі далейшаму разьвіцьцю дзён беларускага, аб прыходзе старых дзён маліліся.

Здаецца гэта так нядаўна было. 4—5 год прайшло з гэтага часу. Але ў наш час бурна-напорна дні ідуць, нібы крыгі вясеньняй паводкі.

Адвандравалі Красінскія і Азбукіны. Крыгі-дні з наежджанымі, натуранымі на іх сьцежкамі-дарожкамі плыняю вод вясеньніх зьнесены.

Паблеклі мары пра зварот мінулага... А людзі?

— Те умерли, а те далече,—
Как Сади некогда сказал.

Як сымбаль краіны плакучых бароз, як рэлікція для «сьвядомых» беларусоў, як рэдкая музэйная каштоўнасьць, бярозавы кіёк Красінскага доўга потым аздабляў сьценку ў музэі. І пашпарт быў у гэтага гістарычнага кійка, пісаны пашпарт:

— З гэтым кійком Красінскі хадзіў, шукаў шчасьця для народу беларускага па Магілёўшчыне, Віцебшчыне, Аршаншчыне...

Сьвяты кіёк сьвятой асобы!

— Кіёк,—выхаваўчы сродак ня толькі тады, калі ён ходзіць па сьпіне!—так разважаў хітры поп.

Падалей ад грэшнай бальшавіцкай зямлі, супроць спраў бальшавіцкіх, бяз слоў прасіўся ў спадарожнікі бярозавы кіёк Красінскага. Пра курганы старажытныя з жыхарамі «шчасьлівых» сівых часоў, пра прыход новых дзён, пра сьмерць бальшавіцкіх спраў, песьню-мару бяз слоў і гукаў сьпяваў «посах» былой духоўнай асобы.

Краіна курганоў, царквей, касьцёлаў, старых палацаў,—вось малюнак, якім хацелі прывабіць «сьвядомыя» прарокі-«вучоныя» несьвядомую масу...

— Раней, у дні старадаўніны, людзям жылося ляпей чым зараз, таму што нават у курганох мы знаходзім золата і іншыя шляхэтныя рэчы,—так разважаў «географ» Азбукін.

— І песьня ранейшая, і казка старая лепш чым песьня, лепш чым праўда нашых дзён!—падхапілі падгалоскі.

І «нурцуровых ветразей узьвівы» пад уплывам бярозавых настрояў Красінскіх, Азбукіных па-над лясамі, па-над балотамі, па-над рыпітаваньнямі новай будоўлі, мінуючы праўду новых дзён, несьлі некаторых лірыкаў назад, у мінуўшчыну.

А за лірыкай «цьвярозыя» палітыкі каскрэпна меркавалі—як павярнуць жыцьцё задам, як... «хватиться за хребет... только задом наперед»...

Кійка бярозавага—няма ў музэі. Выкінуты.

А геаграфія Азбукіна і пасьля вандраваньня аўтара з Красінскім нічога новага не адзначыла на шляху вандраваньня.

Сьмяецца стары Дняпро

— ... Пусти меня! Мой старый дом
На берегу Днепра крутом,
Вблизи границ Литвы чужой
Порос могильною травой.
Пробудь я здесь еще хоть год,
Он догниет и упадет».

(Лермонтов—«Боярин Орша»).

— «Памяць мінулага—з дьмам!»
(Чарот).

Былі вандроўцы-«вучоныя» у Воршы. Былі на толькі Красінскія і Азбукіны. І з кійкамі і бяз кійкоў, і раней і пазьней, прыяжджалі і прыходзілі эмагары старададаўніны, каб паглядзець на стары Дняпро, палюбаваца яго крутымі берагамі, пабачыць рэшткі валаў гарадзкіх, старажытныя палацы і царквы, перакананца, што ўсё гэта ёсьць, што ўсё на сваім месцы, што ўсё як-раз так, як напісана ў Сямёнава:

«В городе три православных церкви, из которых две каменных, и мужской Покровский монастырь, в котором есть одна каменная церковь; наконец, в городе расположены римско-католический каменный костел, еврейская синагога и до 10 еврейских молитвенных школ».

І далей:

«Несмотря на удобное местоположение (шоссе, две железные дороги, р. Днепр), Орша отличается от других уездных городов Могилевской губернии относительной бедностью своей жизни. В Орше бывает в году одна незначительная ярмарка 9 мая. Разного рода промышленных заведений в городе насчитывается более 40 с более 200 рабочих». (П. П. Семенов—«Полное географическое описание нашего отечества». Изд. А. Ф. Деверина, 1905 г.).

Дзьвесьці рабочых на 40 прадпрыемствах! Сорак саракоў царквей, касьцёлаў, сынагог, маліцьвенных дамоў! «Адносная беднасьць жыцьця!..»

Сьмехам вясеньнім сьмяецца стары Дняпро. Новым людзям, новаму размаху жыцьця дзівіцца. Ня ведае сівы сьведка былых дзён, прабягаючы Воршу, што ніжэй у былой Запароскай Сечы новыя людзі, жалезабэтонныя загароды—гэблі на шляху яго паставілі, што круціць турбіны-волаты прымусяць там старога гуляку...

Але і тут бачыць старына, што не па Сямёнаву і не па Азбукіну новую геаграфію піша жыцьцё...

Красуня Гэклінг

— «Ня сну ўчарайшаму, а праўдзе сёньня вер»...

(Чарот).

«Бачыла Таня як лён у полі цьвіце»...

У старой дзіцячай чытанцы у школьнікаў чытаралі, завучвалі дзеці сумны жыцьцёпіс вясковай ільняной кашулі:

— «Как рубашка в поле выросла».

Вырасталі вясковыя Тані. Ад ільняга семя да апошняга вузелка ніткі рукамі ўласнымі: «выпрошчала нитки, вымочила, вымяла, высушила, вычесала, вымяла, выбила, выкрасила, выкрутила, выполоскала, высушила, выгладила, сложила, сшила, вышила, выкроила, сшила, вымыла, выгладила, надела, вымяла, выбила, выкрасила, выкрутила, выполоскала, высушила, выгладила, сложила, сшила, вышила, выкроила, сшила, вымыла, выгладила, надела».

Шмат песен чула кашуля раней чымся прыкрыць плечы пакутніцы Тані. Больш сумныя песьні сьпявалися над ільняной кашуляй.

«Сидя за прялкой в осеннюю зьюгу
Пела крестьянка лучину в тиши,
И доверяла той песне как другу
Жгучую скорбь наболевшей души»...

Разам з мычкамі ільняными гоў мыкалі бедныя вясковыя дзяўчаты і кабеты... За тое кулак-багацей, гандляр-адкупшчык ня ведалі «ни песен, ни слёз».

Больш за ўсё яны разумелі—

— «Пряди, моя пряха, пряди не ленися».

... Шуміць Дняпро. Вясеньнімі маладымі ўсплескамі адказвае на бурнае жыцьцё высокіх берагоў. Ня цэрквы, не касьцёлы, не палацы баярскія ценямі засьцілаюць сталёвыя грудзі Дняпро. Новыя волаты-сілуэты дхамі ўніз адбіваюцца ў люстэрку вод. Новая Ворша вырастае на адлёце ад старых помнікаў мінулага.

На пустыры, у 2 кілёмэтрах ад гораду, у XIII-гадавіну Кастрычніка пушчаны быў часальны корпус Аршанскага лёнакамбінату. Побач з часовымі баракамі для будаўнікоў вырас вялізны жыльлёвы дом для сталых рабочых камбінату. У лінію вытягнуліся 6 прасторных фабрычных складаў. Ля варот складу ляглі рэйкі чыгункі. Вузкія рэйкі прарэзалі склады, двор і часальны корпус...

Гоніць гарачую электракроў Сталінская БелДРЭС. Жыцьцё дае рукам сталёвых машын, каб лён часам, як мычкі мыкалі, блёскучыя шаўковістыя, нібы скруткі бялёсых [illegible] дзяўчыны. Ня лучыну сумную, новую песню сьпявае красуня Гэклінг?..

У Амэрыцы нарадзілася Гэклінг. Вялікая, прыгожая бліжчыць яна мне талем і слухмяна ў тахт з рукамі дзьвёх памочніц, жывых дзяўчат, заб'ёвае тэмп новай, нашай песьні, зрозумелай бяз слоў—

Дагонім і перагонім...

Дзяўчынка - камсамолка Хомчанка добра ведае гутарку сталёвай красуні. [illegible]

САЦСПАБОРНІЦТВА--МАГУТНЫ ВАГАР БАРАЦЬБЫ

за сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за ажыцьцяўленьне шасьці ўмоў тав. Сталіна ў калгаснай вытворчасьці і пасьпяховае правядзеньне веснавой сяўбы

Аўладаць вопытам перадавых

Вопыт сацспаборніцтва і ўдарніцтва пралетарскіх прадпрыемстваў шырока ўкараніўся і ў калгасной вытворчасьці. Магутнай хваляй сацспаборніцтва і ўдарніцтва разгарнулася барацьба за моцны калгас, за моцную сацыялістычную гаспадарку. Рад калгасаў паказваюць баявыя прыклады гэтай барацьбы.

За 1931 год Наркамземам і Белкалгасцэнтрам прэм'яваны 171 калгаснік-ударнік і работнікі райкалгассаюзу грашовымі прэм'ямі на 43.527 руб. і прэмтаварамі на суму 40 тыс. руб. Апрача таго, рад калгасаў прэм'яваны машынамі і інш. с.-г. інвэнтаром.

Ударнікі - калгаснікі зьяўляюцца прыкладнымі ў рабоце, яны—у першых радох барацьбы за бальшавіцкія тэмпы ў калгаснай вытворчасьці.

Напрыклад, у калгасе «Сейбіт», Петрыкаўскага раёну, група калгаснікаў-ударнікаў паказваюць сапраўдныя ўзоры барацьбы за высокія бальшавіцкія тэмпы, за якасьць работы.

Аб іх павінна ведаць уся калгасная грамадзкасьць БССР. Вось яны: **Гурыновіч Раман**—96 год, усё сваё жыцьцё да ўступленьня ў калгас батрачыў, у летні сэзон мінулага году, капаючы канаву ў калгасе для мэліярацыі даваў штодзённую норму выпрацоўкі 12 кубамэтраў. Ён выпрадаваў на гэтай рабоце 227 працадзён. Пасьля сканчэньня гэтай работы Гурыновіч увосень быў перакінуты на пераапрацоўку лёну, і тут таксама паказваў высокія, ударныя тэмпы работы. Гурыновіч прэм'яваны, як лепшы ўдарнік.

Яновіч Алесь, Шамрыла Ўлас—лепшыя ўдарнікі калгасу «Сейбіт».

Такіх калгаснікаў-ударнікаў у калгасе «Сейбіт» цэлая група. Яны вядуць за сабой астатніх калгаснікаў. Дзякуючы ўдарнай рабоце калгас расьце і мацнее. Два гады назад у калгасе было 13 гаспадарак і 129 га зямлі, а зараз—103 гаспадаркі з плошчай у 930 га. За мінулы год калгас пабудаваў абору на 160 галоў, сьвінарнік—на 96 штук і маслазавод. Калгас «Сейбіт» своячасова выканаў на 100 проц. усе віды загатовак, калгас пастаянна дае на адыходніцтва 50-60 чалавек. «Сейбіт» раней усіх астатніх калгасаў у раёне поўнасьцю падрыхтаваўся да сяўбы. Старшыня гэтага калгасу прэм'яваны Калгасцэнтрам за лепшую падрыхтоўку да веснавой сяўбы.

Дырэктар Мсьціслаўскай МТС тав. РАГАЧОЎ, прэм'яваны за добрую работу.

Такія-ж прыклады работы, барацьбы за калгасную сацыялістычную жывёлагадоўлю даюць ударнікі калгасу «Камінтэрн» (Магілеўскага раёну).

Наш друк штодзенна паказвае перамогі лепшых калгасаў, якія дасягнуты ў выніку разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

1 мая мы сьвяткуем трэцюю гадавіну сацспаборніцтва. Гэты дзень павінен стаць днём пачатку далейшага разгортваньня сацыялістычных форм працы, далейшай барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за практычнае ажыцьцяўленьне 6-ці ўмоў т. Сталіна ў калгасной вытворчасьці.

У далейшым разгортваньні сацспаборніцтва ў калгасах неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на ажыцьцяўленьне задач трэцяй бальшавіцкай сяўбы.

Праверка выкананьня высунутых абавязацельстваў, без якой немысьліма сапраўднае сацспаборніцтва, павінна стаць штодзённай работай калгасаў, партыйных арганізацый і незавога друку.

Вэтурач—ударнік тав. ЛАНЬКО саўгасу «Сялец-Гаўрыленка».

Правільная расстаноўка ўдарнікаў, улік іх вопыту, перанясеньне гэтага вопыту ў адстаючыя зьвенні—важнейшыя ўмовы пасьляховага правядзеньня веснавой сяўбы.

Шырока ўжываючы новыя формы сацспаборніцтва (сустрэчныя пляны, грамадзкі буксір, калгасная ўзаемадапамога і інш.), пашыраючы фронт ударніцтва, асвойваючы і ўкараняючы вопыт лепшых у штодзённую практычную работу—калгасы БССР выйдуць з поўнай перамогай з трэцяй бальшавіцкай сяўбы, дасягнуць новых рашаючых перамог у барацьбе за моцную сацыялістычную гаспадарку.

Калмык.

За лепшую падрыхтоўку да трэцяй бальшавіцкай вясны

За правільную арганізацыю сталых вытворчых брыгад, за поўную засыпку насенфондаў і насендапамогу іншым калгасам, за поўнае выкананьне пляну рамонту с-г машын і інвэнтара, за здавальняючае правядзеньне аг ратэхнічных мерапрыемстваў.

Белкалгасцэнтр прэм'яваў наступныя калгасы, лепшых калгаснікаў і асобных работнікаў калгаснай сыстэмы:

КАЛГАС «КІМ»—Чырвона-Слабодзкага раёну: 300 руб. на абсталяваньне ясьляў і 100 руб. для старшыні калгасу тав. СМОЛІЧА.

КАЛГАС «ЧЫРВОНЫ КАМУНАР»—Жлобінскага раёну: 300 руб. для прэм'яваньня лепшых ударнікаў і 800 руб. дадатковага крэдыту на пабудову кароўніка.

КАЛГАС ІМЯ ДПУ—Менскага раёну: 300 руб. для прэм'яваньня лепшых ударнікаў.

КАЛГАС «ЧЫРВОНЫ ШТАНДАР»—Ельскага раёну: 300 руб. прэмтаварамі для прэм'яваньня лепшых ударнікаў і 200 руб. для старшыні калгасу—тав. БУЦКАГА.

КАЛГАС «СЕЙБІТ»—Петрыкаўскага раёну: 200 руб. для старшыні калгасу тав. БЕЛАСТОЦКАГА.

Старшыня ЧЫРВОНА-СЛАБОДЗКАГА РАЙКАЛГАССАЮЗУ тав. КАВАЛЬЧУК прэм'яваны 200 руб.

КАЛГАС ІМЯ ГОМЕЛЬСКАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ—Лоеўскага раёну занесены на чырвоную дошку і вызначаны кандыдатам для прэм'яваньня.

Дабіліся суцэльнай пісьменнасьці

(З рапарту рабочых будаўнікоў Менскай цэнтраэлектрацэнтралі)

На будаўніцтве Менскай цэнтраэлектрацэнтралі пачаліся заняткі ліквпункту ў лютым г. г. і дзякуючы калектыўнай працы, пры дапамозе партыйнай, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацыі дасягнуты наступныя вынікі:

— Працавала ў нас 9 груп з іх: 3 беларускіх, 1 ідыйская, 1 расійская, 1 польская і 3 украінскіх, у якіх навучалася 131 чалавек.

У працэсе заняткаў з ліквпункту пераведзена ў групы малапісьменных 117 чалавек, з групы малапісьменных у вышэйшую групу—14 чалавек. Акрамя гэтага ліквпунктам было накіравана ў вячэрнюю рабочую школу 25 чалавек.

На сёнешні дзень на пабудове мы ня маем ніводнага ніпісьменнага і абвяшчаем калектыў нашай пабудовы суцэльна-пісьменным.

Усе былыя ніпісьменныя і малапісьменныя падпісаліся на назыку «пяцігодка ў чатыры гады», уступілі ў рады МОПР'у і Асоавіяхіму, а таксама далі абяцаньне далей працягваць вучобу і дапамагаць уноў прыбыўшым ніпісьменным ліквідаваць ніпісьменнасьць.

Сакратар партячэйкі МІЦЭЦ **Гунько.**

Старшыня пабудкому **Сарзер.**

Кіраўнік ліквпункту **Вайлевіч.**

Ударніца тав. ЖДАНОВІЧ,—старэйшы брыгадзір гаспадарча - разьліковай брыгады сьвінароў саўгасу «Старыцы»

Пад знакам барацьбы за пяршынства

КЛІМАВІЧЫ. Калгасы Дамамерыцкага сельсавету выйшлі на поле і пачалі ворыва. Калгас імя Калініна пачаў сяўбу ячменю.

Работа праводзіцца пад знакам барацьбы за пяршынства ў выкананьні задач конкурсу «Праўды». Выдаюцца брыгадныя насьценгазэты штодзённі, якія на баявому змагаюцца за посьпехі веснавой кампаніі.

З вучняў ШКМ складзены брыгады па абслугоўваньні калгаснікаў у часе пасеўнай.

Дзякуючы баявой рабоце ніізавога друку пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі, калгасы Дамамерыцкага сельсавету скончылі засыпку насенфондаў па зярнёвых на 102 проц., па бульбе на 100 проц. Рэалізацыя насеннай назыкі імя конкурсу «Праўды» забясьпечыла поўнае выкананьне пляну па засыпцы насеньня.

Калгаснікі заяўляюць, што пасеўную кампанію яны правядуць з посьпехам, на баявому рэалізуюць пастанову ЦК аб ніізавым друку. **П. К.**

Конюх-ударнік тав. АРДЗІН, калгасу «Пабеда», Мікалаевіцкага сельсавету, Віцебскага раёну.

Справа ў людзях

Брыгада сьвінароў калгасу «Камінтэрн», Слабадзкога сельсавету, практычна даводзіць:

— што посьпех у сацыялістычнай сьвінагадоўлі забясьпечваецца далёка не адными ўзорнымі сьвінарнікамі,—гэтага мала;

— што, наадварот, сакрэт перамог ва ўзорных сьвядомых адносінах людзей, пры наяв нявыстарчальных матар'яльных мажлівасьцях;

— што задача партыі і ўраду аб вырашэньні ў асноўным мясной праблемы на працягу другой пяцігодкі брыгадаю цяжам усьвядомлена і ва ўмовах слайго калгасу непасродна рэалізуецца.

У СТФ калгасу зараз ёсьць 137 парасят, 71 падсьвінак, 11 кныроў, 56 сьвіноматак, ад якіх да канца году трэба атрымаць прыплод да 400 галоў.

— І атрымаем,—упэўнена кажа загадчык СТФ Іван Фралоў... І атрымаем, бо толькі за апошнія 10 дзён стада вырасла па 84 галавы! Адыход маладняка ў 1930 годзе складаў 2 проц., у 1931 годзе—1 проц. Сёлета адыходу амаль-што няма.

У сьвінарніку—парадак. Штодня чысьцяцца станкі, мяняецца подсьцыл. Пасьля кожнага прыёму ежы мыюцца кармушкі. На дзьвярцах кожнага станка—нэтлік, з аднакаю ўзросту, пароды сьвіньні, тэрміну злучкі, ці апарасу.

Уся ўдарная брыгада сьвінароў пічыра зацікаўлена ва ўзьняцьці якасьці прадукцыі фэрмы, зацікаўлена ў выкананьні і перавыкананьні свайго прамфінпляну. У ёй—9 чалавек. Канчаткова ліквідавана абязьліч ка—і ў гэтым адна з умоў, высунутых камінтэрнаўскую СТФ на першае месца ў раёне.

Кожны член брыгады ведае сваё месца. Усе сьвіньні разьмяркаваны на 4 групы. Да кожнае групы прымацавана адна асноўная сьвінарка, якая і адказвае за дагляд яе. Адна работніца працуе ў зьмену па ўсіх чатырох групах, дзьве завіхаюцца на кухні і адна сочыць за падвозкай вады і кармоў.

Харчуюцца сьвіньні па так званых нормах Нанова, пры суровай рацыянізацыі і эканоміі кармоў (звычайна да іх дадаюцца кораньплоды). На дарослую сьвіньню адпускаецца ў дзень 3,5 кармавых адзінак (за адзіку бярэцца 1 кілёграм мукі), на сярэднюю—2,5 і на малую—1,5 кілёграма. Бульбы—на дарослую 4 кілёграмы, сярэднюю—2,5 і на малую—ад 1 да 2 кг. Дарослыя кормяцца 2 разы ў дзень, а маладняк—3.

Посьпех у гэтай справе, паўтараем, заваёўваюць улада надабраных для фэрмы людзі. Брыгада сьвінароў у «Камінтэрне» моцна згуртавана агульнай адданасьцю сваёй справе і непасрэдным, жывым энтузіязмам. Прыкладам сапраўднае зацікаўленасьці да маладняка і сьвінога пагалоўя можа служыць хоць-бы настойлівае, добраахвотнае жаданьне дзяжурыць каля паросных матак. Гэта жаданьне звычайна выліваецца ў «спрачкі»: кожная сьвінарка хоча лепш прыняць і дагледзець поваанароджаных... І дзяжурыць цэлую ноч.

Усім сьвінаром праца ўлічваецца ў памеры 1,25 працадня—як за цяжкую работу. Яны ня раз прэм'яваліся,—грашмі, мануфактурай.

Добрасумленныя, узорныя адносіны да сваіх абавязкаў, перш за ўсё выяўляе загадчык СТФ тав. Фралоў. Іван Фралоў кончыў у Горках двухмесячныя сьвінагадоўчыя курсы. Гэта ён, адразу-ж пасьля прыезду з курсаў, завёў на фэрме карыленьне па норме, арабіў суровы падзел функцый сьвінараж, увёў дакладны ўлік выдаткаваньня кармоў, тэрмінаў злучкі і апаросу. Да яго працавалі ўсяго ўтраіх—у брудным і цесным сьвінарніку.

Іван Фралоў, апрэм асноўнай работы, мае безьліч грамадзкіх нагрузак: працуе па рэалізацыі калгасных прананоў, у рэдакцыі штодзенкі, у камісіі па праверцы цэн у каапэрацыі і арцелях і яшчэ шмат у якіх камісіях і арганізацыях.

Сьвінары—ударнікі ўпарта змагаюцца за якасьць стада, за выхад тавернай прадукцыі да канца году.

— Здамо (прадамо) дзяржаве з перавышэньнем, будзьце ўпэўнены,—гаворыць сьвінарка Мельнікава. Мы высоўваем сустрэчны: замест 100 здамо 120, а то і 130 галоў.

— Вядома здамо 130,—паўтарае Аксіньня Ігнацьева, бо ў нас з 2-га кварталу пачнецца буйны рост... Ого, пагалоўе расьце як на дражджах!

І гэта—ня пустыя словы: злучную кампанію 1931 году брыгада сьвінароў сустрэла падрыхтаванай. У выніку—лішкі сьвінаматак амаль няма.

Брыгада разгарнула сацыялістычныя мэтады працы ўнутры свайго калгасу, у першую чаргу выклікаўшы на спаборніцтва малочную фэрму. Пасты штодзенкі «За сьцяг Праўды»—сысто матычна правяраюць ход выкананьня ўсіх пунктаў умовы. Члены брыгады самі актыўна ўдзельнічаюць у штодзённых і іхнія допісы значна дапамагаюць справе.

Аднэй з першых брыгада ўключылася ва Ўсебеларускі конкурс на лепшага сьвінара. Умову конкурсу тады-ж абмеркавалі на вытворчай нарадзе; цяпер яна даведзена да кожнае сьвінаркі.

У брыгадзе зразумелі, што конкурс—не самамэта, а сродак у барацьбе за далейшае развіцьцё сьвінагадоўлі.

У адпаведнай пастанове сьвінары СТФ узялі на сябе, сярод іншых, такія абавязацельствы:

— Давесьці на працягу году сьвіное стада да 400 галоў, укамплектаваць адкормачнік, які будзе на 300 галоў сьвіней. Змагацца за павялічэньне вагі кожнай сьвіньні (дабіцца вагі парасяці ў 6-месячным узросце да 50 кг.).

— Кантрольныя заданьні па здачы тавернай прадукцыі дзяржаве выконваць своячасова, і вызначаную паводле пляну 2-га кварталу 1 тону прадукцыі даць да тэрміну.

— Дабіцца сярэдняга апаросу на працягу году ня менш 11 парасят ад адной сьвіньні. У зьвязку з тым, што ў красавіку—вялікі прыплод, устанавіць дзяжурствы па фэрме. Для раўнамернага выгадаваньня парасят практыкаваць пераажідку парасят ад тэй маткі, у якой іх больш, да другой маткі.

— Дабіцца поўнага пакрыцьця матак у тэрмін і давесьці ялавасьць да мінімуму.

У сваёй пастанове сьвінары просяць праўленьне неадкладна ацяніць сьвінарнік і вызначыць неабходную колькасьць патрэбных кармоў, шляхам мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, а таксама забясьпечыць правільную грашовую аплату, згодна пастановы Калгасцэнтру БССР, той сьвінарцы, ад якой здан цэнтнэр тавернай прадукцыі.

Брыгада выклікала на сацыялістычнае спаборніцтва ўсе сьвінагадоўчыя тавернай фэрмы Магілеўскага раёну.

Сваіх посьпехаў і дасягненьняў камінтэрнаўская СТФ дабілася выключна дзякуючы правільнаму кіраўніцтву калгаснай партячэйкі.

Тав. Фралоў так і гаворыць:

— Сакратар ячэйкі ў нас на фэрме штодня бывае,—цікавіцца справай і дзелавыя прапановы дае. Каб не ячэйка, было-б дрэнна, бо старшыня калгасу, трэба сказаць, не аддае СТФ належнай увагі.

І ён пералічае:

— Пастуха нам не даюць, а бяз яго цяжка, сьвіней няма як выпусьціць на выган... Работніц адрываюць на іншыя вучасткі... А што важнэй за тэрыкнарнага нагляду—дык пакуль за нікірку ня выцягнеш—фальчар ніколі сам ня прыедзе! Зноў-жа вагі дагэтуль ніяк не атрымаеш... І вада далёка.

Зжаўшы гэтыя пасобныя недахопы, развіваючы і надалей бальшавіцкія тэмпы росту, камінтэрнаўская СТФ сапраўды здолее стаць у шэрэгу лепшых фэрм ня толькі раёну, але і ўсёй рэспублікі.

Юрка Лявонны.

Магілеўшчына.

—мэханік. Яна накладае роўнамерна на сталёвыя пляжкі жмені лёну. Гэклінг плянку з лёнам спрытна прыціскае зьверху другой пляжкай, сама зьвінчвае іх вінтом і зьвешвае ўніз космы лёну для чэсаньня...

Распушчанымі бялёсымі валасамі не расоўваюцца космы, зацісьнутыя ў бязубых сківіцах, усьцяж машыны, то апускаючыся ўніз, то ўзьнімаючыся ўверх.

Мерна варочаецца вакол гарызантальнай восі вострая сталёвая шчаціна. Вожык-грэбень падстаўляе спачатку рэдкія, а потым больш і больш частыя сталёвыя калючкі.

На тонкія валокны разьбіваюць вострыя і частыя сталёвыя зубы табачныя, цёмна-зялёныя, сьветла-зялёныя космы лёну, пакуль ён не ачысьціцца ад кастрыцы, пакуль ня пойдзе лягчэй шаўкавістай тонкай хвалай ачос, пакуль ня дойдзе карэтка з лёнам да процілеглага краю машыны.

Паверне тады слухмяная красуня Гэклінг карэткі верхам уніз, разьвяніць сама вінт, перасуне лён, каб больш канцоў пакінуць для зубоў, каб лепш ачысьцілі і прачасаць усю жменю. І пойдзе назад усьцяж машыны з другога боку карэтка, не адна, а дзясяткі карэтак з чыстым шаўкавістым лёнам, да другой дзяўчыны, што стаіць побач з пакладчыцай-мэханікам Хомчанкай. Рэдка спыняецца машына ў камсамолкі Хомчанкі. Ведае маладая дзяўчына як хуткую дапамогу аказаць сваёй сталёвай прыцельніцы. Ня толькі сама працуе, другіх вучыць як аўладаць складанай тэхнікай. Машына Хомчанкі перавыконвае прамфінпляж.

Не адна Гэклінг сьпявае новую дзіўную песьню ў часальным цэху Аршанскага лёнакамбінату. Іх больш дзясятка. Сотні-тысячы шаўкавістым мычак узьнімаюць карэткі машыны Гэклінг...

Таня, ды ня тая

— «Дарогай сялянку за працай спаткаў я.
Ўсьміхнуўся ў вачох яе вольны сусьвет».
(А. Александровіч).

Не адна тав. Хомчанка зьмяніла драўляны грэбень з традыцыйнай шырокай вясковай лавай і песьняй пакуты на сяброўства з красуняй Гэклінг, на новую песьню машын на канцы, на-за сьцянамі фабрыкі. Гэлектыўную сацыялістычную працу. Іх сотні, іх блізка паўтысячы. Памочнікі майстраў, мэханікі, рэзчыкі, сартоўшчыкі—пераважна жанчыны. Прэсоўшчыкі, возчыкі—мужчыны.

Адны ўжо даўно працуюць тут, асвоіліся з фабрыкай як з роднай хатай, асвоілі складаную тэхніку машын, зрабіліся кваліфікаванымі рабочымі і работніцамі. Другія паступова, але упарта ўрастаюць у фабрычнае жыцьцё, з ахвотай ідуць на штурм цяжкасьцяй па асваеньні тэхнікі. Ад трэціх яшчэ густа нясе вясковай хатай, пахам аўчыны, сумным настроем селяніна, які адно што травіў у горад, які зьмяніў ціш вёскі на сталёвы грукат гораду, на нязвыклую песьню машын. А ёсьць і такія настрої, якія цяжка вызвіць, якія мімаволі зварочваюць на сябе ўвагу тады, калі ідуць непаладкі на фабрыцы, калі раптам спыніць свой рух машына, альбо вы ходзіць са строю складны прэс...

А разам з Хомчанкай, разам з ударніцамі-камсамолкамі Чаплінскай і Саснаўскай, якія таксама перавыконваюць прамфінпляж, якія прыкладам сваім пашыраюць рады ўдарнікаў,—ёсьць і такія «ударнікі», як Лабуноў і Федарцоў. У іх, калі і ёсьць што ўдарніцкае, дык толькі назва. Часта рвач гаворыць вуснамі гэтых ілжэ ўдарнікаў. Былі і прарывы на фабрыцы. Спыняліся турбіны БелДРЭС-у з-за недахопу торфу. Спыняла тады і свой рух Гэклінг, адмаўляліся працаваць прэсы...

Але гэта не галоўнае. Цікучасьць рабочай сілы перашкаджае асваеньню тэхнікі складаных машын. Недахоп кваліфікаваных рабочых адбіваецца адмоўна на якасных і колькасных паказьніках барацьбы за прамфінпляж.

Барацьба за аўладаньне тэхнікай—вось што стаіць зараз першым пытаньнем парадку дня. І тут мае сваіх энтузіястаў фабрыка. Старэйшы брыгадзір тав. Бяляеў абвясьціў сябе ўдарнікам па выхаваньні кадраў. Былы чырвонаармеец Фрумкін, камсамолец Завадзкі, камсамолка Маслава, рабочы Арома Ахрэм, работніца Ніна Бэрштэйн—зьявіліся ініцыятарамі саспаборніцтва на фабрыцы, паказваюць прыклад ударнай работы для паступаючых на фабрыку вясковых дзяўчат.

Здаровае пераможа!

Вясковыя Тані тое-сёе ўжо чулі і чулі яны як сталёвы конь-трактар узьнімае цаліну пад лён, як за трактарам складаная сеялка раскідае бліскучае семя лёну. Як лёнацерабілка бярэ лён, як валы нявыглядная машыны «Эдзі» трысьцяць ільняныя галоўкі, як складаныя машыны лёназаводу апрацоўваюць трасту ў валакно. Бачаць цяпер яны як самаўпэўнена і чотка робіць рухі Гэклінг—машына, каб расчасаць лён для прахі...

Ведаюць яны, што і праха будзе ня простая. Побач з часальным корпусам ужо разьбіта месца і пачынаюцца работы па пабудове прадзільнага цэху, а далей падрыхтоўваецца месца для ткацкага цэху.

Новую дзіўную аповесьць расказвае жыцьцё фабрычнай Тані і тут пад стукат машын часальнага цэху і там, у рабочым клюбе, у новым доме, новую аповесьць пра тое—

«Как рубашка в поле выросла».

Ні золата закапанае ў старых курганах, ні бліскучая пазалота царквей, ні салаўіныя песьні Красінскіх і Азбукіных ні на якіх «пурпуровых ветразях» не пацягнуць работніцу Таню ў мінулае, каб мыкаць там разам з мычкамі свае гора, каб сьпяваць пад нудное жужаньне верацяна сумную песьню пакуты...

Гарыць старая зямля

— «Думкі як іскры ружовым сьвітаньнем,
Думкі як іскры асьвечваюць шлях
— З намі вясна!
— Таварышы, з намі!
Трымайце горда Чырвоны сьцяг!
А. Александровіч.

Што мінуўшчына? Шэрай плямай, нізкімі драўлянымі домікамі павісьлі на над Дняпром старыя ўскраіны Воршы. Як жудасны ўспамін мінулага від неецца на левым беразе Дняпро званіца старога манастыра...

Дзьвесьці рабочых на 40 прадпрыемствах, «адносная беднасьць жыцьця», дзясяткі баяр, вяльмож, тоўстапузых купцоў і папоў, і тысячы галодных і паўгалодных пакутнікаў... Вось аб чым гавораць успаміны старой Воршы.

А вось праз бераг Дняпро. Творца новага жыцьця—чалавек будуе сам для сябе, па сваім гусьце...

За лёнакамбінатам паставіў ён вялікі мясакамбінат. А там далей, на гары ўзьмятнуў уверх высокай вежай волат-элеватар. Яшчэ далей бягуць полем, бягуць лесам слупы БелДРЭС-у, новай бальшавіцкай пабудовы, з палаючым сэрцам, якое пасылае электра-кроў ня толькі Воршы, а і Віцебску, і Магілеву, і Шклову, каб круціць там шківы фабрык і заводаў, каб па-новаму прыводзіць у рух чалавека...

Глядзіць стары дзед, стары жыхар якой-небудзь вёскі Арэхі, што побач з БелДРЭС-ам як успамін старога засталася, глядзіць і мармыча бяззубым ротам:

— Іш, паляць старую зямлю...

— Гэта пра торф, дзед, кажаш?—пытаецца дзядулю ўнук-піонэр.

— Так, гарыць старая зямля,—уздыхае дзед.

— А што, табе шкода?—прыстае ўнук.

— Ня шкода, а дзіва... Вось гарыць зямля—торф чырвоным сьвятлом, а ў лямпачцы Ільліча, што ў нашай хаце, сьвятло белае, як сонца, як дзень...

— Таму што машына, і электра—тлумачыць унук.

— А дзе гэтую машыну робяць?—

— І прывозім і самі робім...

Глядзяць з прытаеным сьмехам з глыбокіх упадзін, з-пад густых сівых брывей дзедавыя натухаючыя вочы.

— Іш, самі?!—ні то пытаецца, ні то дзівіцца дзядуля.

— Так, самі! Дагонім і перагонім, таму-што...

Жыцьцём новым сьмяецца ўнук. Сьпешаецца некуды. Крычыць дзеду:

— Дзядуня! Імая амаль-што ва ўсіх калгасах Аршанчыны загараюцца лямпачкі Ільліча!..»

Стары дзед, але ён адчувае, што не куды ўперад напорным крокам ідзе жыцьцё. Падабаецца і яму, што яго ўнук пра дні сучасныя так кажа—

— Мы самі!.

***

З кроўнай зацікаўленасьцю будуць прымаць першамайскі рапарт аб нашых перамогах пралетары капіталістычных краін.

І пад чырвонымі сьцягамі яшчэ больш напорна яны пойдуць уперад, каб уладна, голасна сапраўднага гаспадара рашуча сказаць—

НА ЗДЫМКУ, зьверху зьлева направа: ударніцы МТФ калгасу «Камінтэрн» трактарная калёна Койданаўскай МТС; сілосная вежа калгасу імя XII зьезду КП(б)Б Талочынскага раёну; агнятрывадная вышка калгасу «Перамога»

ПАСТАНОВА САКРАТАРЫЯТУ ЦК КП(б)Б

аб ходзе падрыхтоўкі і пачатку сяўбы ў прыгарадных гаспадарках гор. Менску

К анстатавань, што падрыхтоўка і пачатак сяўбы ў менскіх прыгарадных гаспадарках зьяўляецца зусім нездавальняючымі і пагражаючымі зрывам пасьняховага правядзеньня і сканчэньня сяўбы:

а) вызначаная плошча пасеву не забясьпечана поўнасьцю насеньнем ранніх бульбы, цыбулі, вікі і канюшыны;

б) плян вывазу ўгнаеньня на 15-IV г. г. выкананы толькі на 56 проц., попелу—на 24 проц.;

в) рабочай сілай калгасы забясьпечаны: сталай—на 90 проц., сэзонай—на 22 проц.;

г) парніковых рам заложана толькі на 78 проц.

Гэтакая падрыхтоўка да сяўбы тлумачыцца бездапазнасьцю і бязьдзейнасьцю кіраўнікоў саўгасаў, ЗРК, ЗВК і ТПО, недастаткова разгорнутай партыйнымі і прафсаюзнымі арганізацыямі масавай работы і слабым апэрацыйным кіраўніцтвам з боку Белкапсаюзу.

Сакратарыят ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

За яўную бязьдзейнасьць і очкавіцельства — дырэктара калгасу ЗРК фабрыкі «Кастрычнік»—т. ЮШКЕВІЧА зьняць з работы. Гаркому і Гарпарткому КК вырашыць пытаньне аб прабываньні т. Юшкевіча ў партыі і вызначыць новую кандыдатуру на дырэктара Калгасу фабрыкі «Кастрычнік».

Дырэктару калгасу ЗРК «Бальшавік»—т. ШАПОШНІКАВУ абвясьціць суровую вымову з папярэджаньнем за недапушчальна дрэннае забясьпечаньне насеньнем і працоўнай сілай. Абавязаць фракцыю ЗРК, партыйныя калектывы і фабкомы «Бальшавік» і «Кастрычнік» прыняць рашучыя меры да ліквідацыі прарыву ў правядзеньні вясеньняй сяўбы па іх прыгарадных гаспадарках.

2. За невыкананьне пляну вывазкі ўгнаеньня, закладкі парнікоў, вярбоўкі рабочай сілы і незабясьпечанасьць насеньнем — дырэктаром калгасаў: Агародна-Малочнага Аб'яднаньня Белкапсаюзу—т. ШОРЦУ, калгасу ЗВК «Лекерта»—т. БУРАВУ — абвясьціць вымову.

3. Адзначыць недастатковае непасрэднае кіраўніцтва і нагляд за ходам сяўбы ў прыгарадных гаспадарках з боку Менгаркому КП(б)Б і фракцыі Гарсавету.

4. Абавязаць дырэктароў калгасных аб'яднаньняў БКС і калгасаў, старшынь ЗРК, ЗВК і ТПО скончыць закладку парніковых рам да 15-га мая 1932 г.

5. Абавязаць дырэктара Плодагародняга Аб'яднаньня БКС тав. ЗЕЛІЧОНКА, сакратароў Райкомаў КП(б)Б і старшынь Райвыканкомаў—да 5-V забясьпечыць поўнае выкананьне нарадаў на раньняю цыбулю і бульбу прыгарадным калгасам.

У мэтах поўнага выкананьня пляну пасеву раньняй бульбы менскім прыгарадным гаспадаркам—дазволіць БКС не пазьней 1 мая зрабіць перапіску маючагася насеньня раньняй бульбы з гаспадарак спажывецкай сыстэмы раёнаў, для забясьпечаньня насеньным матар'ялам — прыгарадных гаспадарак Менску, Віцебску, Гомелю і Барысава—абавязаць т. Матэльсона (Насеньаводтрэст) выдзяліць з сваіх фондаў 500 тон насеннай раньняй бульбы.

7. Абавязаць Гарсавет, дырэктароў калгасаў скончыць вывазку ўгнаеньня і мусору на гароды прыгарадных гаспадарак не пазьней 5 мая, мабілізаваўшы транспарт ЗРК, прадпрыемствы і ўстаноў для дапамогі прыгарадным калгасам у вывазцы ўгнаеньня і заворваньні палёў калгасаў.

8. Адзначаючы адсутнасьць канікармоў у прыгарадных калгасах, што пагражае свячасоваму правядзеньню вясеньняй сяўбы,—прапанаваць Саюзпрамкорму—з маючыхся фондаў вылучыць прыгарадным калгасам магчымую колькасьць канікармоў.

9. Папярэдзіць фракцыю прэзыдыуму Белкапсаюзу, што ў выпадку няпрыняцьця неабходных рашучых мер па выкананьні пляну сяўбы раньніх і палявых культур—будзе пастаўлена пытаньне аб прыцягненьні вінаватых да партыйнай адказнасьці.

У адносінах дырэктароў калгасных аб'яднаньняў БКС і дырэктароў усіх калгасаў даручыць ЦКК-РСІ праз дэкаду праверыць іх практычную работу і калі будзе выяўлена, што імі ня створана патрэбнага пералому і не забясьпечана пасьняховае правядзеньне і сканчэньне сяўбы вінаватых у гэтым прыцягваць да суровай адказнасьці.

10. Прапанаваць усім Райкомам і Гаркомам КП(б)Б безадкладна праверыць сумесна з КК-РСІ падрыхтоўку і ход сяўбы ў прыгарадных гаспадарках з вызначэньнем і правядзеньнем практычных мерапрыемстваў забясьпечваючых пасьняховае сканчэньне сяўбы. Разгарнуць масавую растлумачальную работу на прадпрыемствах, прымацаваных да калгасаў, лічачы барацьбу за асваеньне агародаў і падвышэньне ўраджайнасьці гародніны — галавой задачай партарганізацыі.

11. На адным з бліжэйшых пасяджаньняў ЦК заслухаць ход выкананьня гэтай пастановы, з боку ўсіх паказаных арганізацый, а таксама даклады Гомельскага і Віцебскага Гаркомаў па пытаньнях сяўбы ў прыгарадных гаспадарках.

12. Абавязаць рэдактароў газэты «Зьвязда» і «Рабочай» арганізаваць сыстэматычнае асьвятленьне на старонках друку пытаньняў барацьбы за разгортваньне вясновай пасеўкампаніі ў прыгарадных калгасах.

Аб скажэньні савецкага дробнага гандлю каапэрацыйна-гандлёвымі арганізацыямі

Пастанова Бюро ЦК КП(б)Б і Прэзыдыуму ЦККК КП(б)Б ад 22-IV 1932 г.

Бюро ЦК і Прэзыдыум ЦККК констатуюць, што за апошні час выяўлен рад вапіючых фактаў скрыўленьня са вецкай палітыкі цэн, характэрнымі з якіх зьяўляецца:

а) Праізвольнае падвышэньне цэн на прадуктовыя і прамысловыя тавары ў сыстэмах Райспажыўсаюзу, Лесрабкопу, Белгандлю, ЦРК, ЗРК і г. д.

б) Аптовыя зьдзелкі (пакупка, прадажа) тавараў пад відам самазагатовак на раздробным цэнам.

в) Ашуканьне рабочага пакупніка (абвес, абмер) пры водпуску тавараў на адзін кгр, недахоп ад 10 да 50 гр.

г) Прадажа тавараў нізкага гатунку па цэнам вышэйшага гатунку.

д) Прадажа тавараў з прымусовым асортымэнтам.

ЦК і ЦККК лічыць, што гэтыя грубыя скажэньні палітыкі цэн сьведчаць аб недастатковай барацьбе пасобных партыйных, прафэсіянальных і гандлёвых арганізацый з канкрэтнымі носьбітамі нэпманскага духу, што да гэтага часу яшчэ не забясьпечана паўсяменнае партыйнае і гаспадарчае кіраўніцтва кожнай крамай, кожным гандлёвым пунктам.

Выходзячы з вышэйпаказанага Бюро ЦК і Прэзыдыум ЦККК ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Прызнаць да ведама, што пры праверцы правядзеньня дырэктыў партыі аб цэнах даяржаўнай інспэкцыі цэн зьняты з працы і адданы пад суд загадчыкі і работнікі крам, вінаўныя ў праізвольным падвышэньні цэн, злоўжываньнях (абвешваньне і абмерваньне), продажу тавараў з прымусовым асортымэнтам, сьціс якіх давесьці да ведама шырокай савецкай грамадзкасьці.

А) ПА СПАЖЫЎСЫСТЭМЕ.

зьняты з працы і адданы пад суд:

1. Лухавец—заг. крамы Ардейскага спажыў т-ва Полацк.
2. Дворкін—заг. крамы БКС Віцебск.
3. Ярыпоўскі—прадавец крамы ТПО Віцебск.
4. Ланкін—заг. крамы ЦРК ф-кі Крупскай Менск.
5. Крюэмесько— заг. крамы Саранзскага спаж. т-ва Дрысса.
6. Шэнэх—заг. крамы Варонецкага таварыства Полацк.
7. Дрозд—заг. крамы Астровінскага с. т. Полацк.
8. Росіч—заг. крамы Сельпо Жытка вічы.
9. Баравец—заг. крамы Луначарскага с. т. Дрысса.
10. Левін—нам. заг. газ. крамы ЦРК Менск.
11. Мінін—заг. крамы Арлеўскага с. т. Полацк.
12. Васаў—заг. крамы № 7. ЗРК швейн. Віцебск.

ЗЬНЯТЫ З ПРАЦЫ:

1. Варанкоў—заг. крамы ЦРК Віцебск.
2. Хайкін—заг. крамы воднікаў Віцебск.
3. Куква—заг. крамы ЦРК Віцебск.
4. Елкін—заг. крамы ЦРК Віцебск.
5. Шпакоўскі—прадавец крамы с. т. Лельчыцы.
6. Баркан—заг. гандл. адзел. ЗВК Полацк.
7. Макараў—заг. крамы БКС Віцебск.
8. Янкельсон—заг. пасуды. крамы БКС Віцебск.
9. Балтрухоў—заг. крамы Дрэтуньскага с. т. Полацк.
10. Рапапорт—нам. заг. газ. крамы ЦРК Менск.

Б) ПА СЫСТ. БЕЛГАНДЛЮ І ІНШ. АРГАНІЗ.

Зьняты з працы і перададзены суду:

1. Альшэўскі—заг. крамы «Спартак» Асьвея.

ЗЬНЯТЫ З ПРАЦЫ:

1. Васэрман—заг. крамы № 19 Белгандлю Менск.
2. Лазарын—заг. крамы Т-ва Пры. хіл. Дзян. Віцебск.
3. Нахамкін—заг. крамы Сампрамсаюзу Віцебск.

За няўважлівыя адносіны да калькуляцыі цэн на абеды, праізвольнае падвышэньне цэн на абеды і прадукты ў буфэтах, абвешваньне пры водпуске прадуктаў зьняты з працы:

ПА СЫСТЭМЕ ГРАМАДЗК. ХАРЧАВАНЬНЯ.

1. Відман—заг. сталоўкі ф-кі «Дзьвіна»—Віцебск.
2. Грандэ—заг. буфэту на ф-цы Лекерта—Віцебск.

Падвергнуты асабістай чыстцы УШАКОЎ, заг. газав. крамы № 27 ЦРК—Менск.

Прыняць да ведама, што старшыня Бабруйскага Райспажыўсаюзу т. ЭРЭНБУРГ, заг. сэктарам снабжэньня Лесбелу т. ЭСКІНА, старшыня Горацкага Райспажыўсаюзу, тав. ЧАЎЦЕЛЬ за грубае скажэньне савецкай палітыкі цэн прыцягнуты парткалегіяй да партаднасьці.

Бюро ЦК і Прэзыдыум ЦККК адзначаюць, што ня гледзячы на канкрэтныя дырэктывы ЦК і ЦККК аб узмацненьні кантролю і арганізацыі праверкі ў ажыцьцяўленьні савецкай палітыкі цэн Бюро РК і прэзыдыумы РКК Хойніцкага, Полацкага, Талочынскага і Цярахоўскага раёнаў фармальна на аднесьліся да гэтай справы даўшы няправільныя паведамленьні ЦК і ЦККК аб адсутнасьці парушэньняў, між тым вытвараючай паўторнай праверкай ЦККК выяўлена шмат фактаў скрыўленьня савецкай палітыкі цэн за што РК і Прэзыдыумам РКК адзначаных раёнаў паставіць на від.

Бюро ЦК і Прэзыдыум ЦККК КП(б)Б абавязваюць:

а) Гар. і Райкомы, КК—РСІ і парт. яч. каапэрацыйна-гандлёвых сыстэм узмацніць штодзённы кантроль за ажыцьцяўленьнем савецкай палітыкі цэн.

б) Цэнтральным гандлюючым арганізацыям над адказнасьць кіраўнікоў на працягу дэкаднага тэрміну ўстанавіць сыстэму адказнасьці працаўнікоў ва ўсіх зьвяньнях гандлюючых арганізацый за правільную калькуляцыю і прадажу тавараў, узмацніўшы апэрацыйнае кіраўніцтва ніззой сеткай. Папярэдзіўшы, што побач з канкрэтнымі парушэньнямі і кіраўнікамі адказваюць за правільнасьць правядзеньня савецкай палітыкі цэн.

в) ЦСПСБ забясьпечыць выкананьне дырэктыў партыі аб шэфстве рабочых над каапэрацыйна-гандлюючымі арганізацыямі, арганізаваўшы сталы рабочы кантроль над кожнай гандлюючай кропкай (крамы, буфэт, сталоўка, ларок і інш.).

г) ЦП Саюзу Каапэрацыі і Дзяржгандлю неадкладна разгарнуць працу сярод каапэрацыйна-гандлёвых працаўнікоў на падставе соцсаборніцтва і ўдарніцтва ў напрамку лепшага абслугоўваньня спажыўца, водпуск тавараў чыстай вагай, мерай і па ўстаноўленым цэнам, не дапускаючы водпуску тавараў з прымусовым асортымэнтам, вядучы рашучую барацьбу з фармальна-бюрократычнымі адносінамі, разгортваючы крытыку і самакрытыку сярод работнікаў каапэрацыйна-гандлюючых сыстэм.

Бюро ЦК і Прэзыдыум ЦККК прапануюць Дзяржаўнай інспэкцыі цэн па сіліць барацьбу з усялякімі відамі парушэньня савецкай палітыкі цэн.

У СНК БССР

БАРАЦЬБА СА СТРАТАМІ Ў ПАЛЯВОЗТВЕ

У Саўнаркоме БССР 25 красавіка 1932 г. прынята пастанова па дакладах Беларускай Акадэміі Навук і Н. К. Земляробства па барацьбе са стратамі ў палявозтве, у якой вызначан цэлы рад мерапрыемстваў па барацьбе са стратамі.

ХОД КАНТРАКТАЦЫІ ЛЬНУ, ЗБОЖЖАВЫХ КУЛЬТУР, БУЛЬБЫ, ГАРОДНІНЫ, САДОВІНЫ.

Саўнарком адзначыў, што кантрактацыя ўсіх культур веснавога пасеву ідзе зусім нездавальняюча. На 20 красавіка закантрактавана ільна-валакна 42,1 проц., ільнанасеньня 28,7 проц., збожжа—34,5 проц., бульбы—36,6 пр.

Саўнарком адзначыў прыкладнае правядзеньне работ па кантрактацыі тэхнічных культур у Шклоўскім, Суражскім, Лёзьнянскім і Лепельскім раёнах і зусім дрэнную работу ў гэтым напрамку Бальшэйцкага, Дубровенскага, Чаўсускага, Асьвейскага, Борысаўскага, Бягомельскага, Касьцюковіцкага, Асіпавіцкага раёнаў, прычым па 22 раёнах зьвестак зусім няма аб ходзе кантракцыі, што сьведчыць аб адсутнасьці апэрацыйнага кіраўніцтва ў гэтых раёнах.

Значна адстае кантрактацыя ў адных асобных сэктарах, што гаворыць аб недапушчальнасьці многіх раёнаў адзіласобнага сэктару ў кантрактацыі.

Саўнарком адзначыў рэзкае адставаньне ў выконваньні пляну кантрактацыі сеўна ад залакна.

Зусім нездавальняюча ідзе засыпка насенных і страхавых фондаў ільну, канопель, збожжа і бульбы.

Саўнарком абавязаў Беларускую Кантору Заготлён (Шэйнін), Заготкарно (Муромскі), Белкапсадгародніна, (Зялічонак, Наркамснаб (Каменштейн), Наркамзем (Масюкоў), Белбалпрэст (Кондраль), Белкапгасцэнтр (Міцькоў), Трактарацэнтр (Карнажевіч) арганізаваць канкрэтнае апэрацыйнае кіраваньне кантрактуючымі арганізацыямі з тым, каб кантрактацыя была скончана да 6-га мая г. г.

Саўнарком паказаў, што раённыя выканаўчыя камітэты маюць адказнасьць за невыкананьне пляну кантрактацыі наравне з кантрактуючымі арганізацыямі.

Саўнарком абязаў кантрактуючыя арганізацыі і РВК узмацніць растлумачальную работу і шырока папулярызаваць льготы, даныя пасеўшыкам ільну і канапель з тым, каб зьнішчыць адставаньне кантрактацыі адзіласобнага сэктару.

Саўнарком папярэдзіў Беларускую Кантору Заготлён, Клімавіцкі, Гомельскі, Чачэрскі, Жлобінскі, Быхаўскі, Парыцкі, Глускі, Стара-Дарожскі, Пухавіцкі, Клічаўскі, Слуцкі, Капыльскі, Любаньскі, Лагойскі, Плешчаніцкі, Бярэзінскі, Чырвонапольскі, Лельчыцкі, Жыткавіцкі, Нараўлянскі, Петрыкаўскі і Аршанскі раёны, што яны павінны , бліжэйшыя два дні стварыць пералом у кантрактацыі і арганізаваць дачу зьвестак аб яе ходзе, не чакаючы пачуць да іх будуць ужыты меры ўзьдзейнічаньня, як за бязьдзейнасьць і арыў аднэй з зазначэйшых гаспадарча палітычных кампаній.

Для зьнішчэньня недахопаў прапанаваны РВК безадкладна вылучыць брыгады з прадстаўнікоў зямельных аддзелаў, РСІ, кантрактуючых арганізацый для праверкі правільнасьці афармленьня дагавораў па кантрактацыі.

Саўнарком адзначыў зусім нездавальняючы ход кантрактацыі бульбы саўгастрэстамі Наркамзему і абавязаў т. Масюкова праверыць работу па кантрактацыі гэтымі трэстамі і дабіцца рашучага пералому.

За ГРАНІЦАЙ

Сусьветны пралетарыят рыхтуецца да I мая

Супроць імпэрыялістычнай вайны, у абарону СССР.

ЗА РЭВАЛЮЦЫЙНЫ ВЫХАД З КРЫЗІСУ

У Швэцыі, Нарвэгіі, Даніі

СТАКГОЛЬМ. Камуністычныя партыі Швэцыі, Нарвэгіі і Даніі праводзяць энэргічную падрыхтоўку да 1 мая. Галоўнае ўвага канцэнтруецца на барацьбе супроць вайны, выкрыцьці сацыял-дэмакратычнай пацыфісцкай хлусьні, супроць зьніжэньня заработку, за рэвалюцыйны выхад з крызісу.

Ва ўсіх важнейшых рабочых цэнтрах гэтых краін 1 мая будуць арганізаваны дэманстрацыі і мітынгі. Нарвэгія і дацкія рабочыя паслалі делегацыю ў СССР на сьвяткаваньне 1 мая.

У Германіі

БЭРЛІН. 1 мая рэвалюцыйны пралетарыят Германіі будзе дэманстраваць адзіны рэвалюцыйны фронт супроць зьніжэньня заработку і дапамогі па беспрацоўі, супроць капіталістычнага выхаду з крызісу, у абарону СССР. У Бэрлінэ дэманстрацыя адбудзецца ў Люстгартэне. Такія-ж дэманстрацыі будуць праведзены і ў іншых буйных рабочых цэнтрах Германіі. У Браўншвэйгу, Ольдэнбурге, Брэмэне дэма кратычныя і нацыянал-сацыялістычныя мясцовыя ўлады забаранілі першамайскія дэманстрацыі. Працоўныя гэтых правінцый пазбаўлены права, якім яны карысталіся дзесяткі год.

У Грэцыі

АФІНЫ. 20-4. Падрыхтоўку да першамайскіх дэманстрацый грэцкая кампартыя праводзіць пад лёзунгам «супроць імпэрыялістычнай вайны» у абарону СССР і савецкага Кітаю», «супроць усё ўзрастаючай дарагоўлі, супроць наступленьня капіталу». Разгорнута «кампанія за абвяшчэньне 1 мая ўсеагульным 24-гадзіннай забастоўкі».

У Англіі

ЛЕНДАН. 27-4. Учора выехала з Лёндану дэлегацыя з 12 ангельскіх рабочых, чыгуначнікоў, тамазоў, гарнякоў і інш. Для прыгатаваньня на 1-майскім сьвяце ў Маскве. На пробах дэлегацыі ўдзельнічала звыш 1.000 чал.

Дэлегацыя зязе з сабой прывітальныя лісты ад ангельскіх рабочых, якія вітаюць пралетарыят СССР з дася гнутымі бліскучымі дасягненьнямі і клянуцца салідарна выступіць у барацьбе супроць нападу імпэрыялістаў на СССР.

У Польшчы

ВАРШАВА. Па ўсёй краіне адбываюцца масавыя аблавы, вобыскі і арышты. У адной толькі Варшаве арыштавана больш 600 чалавек. У прамысловым цэнтры прыбыла вялікая колькасьць паліцыі. На Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі няма таго гораду, тэй вёскі, дзе-б паліцыя не праводзіла вобыскаў, арыштаў.

Але як ня жорсткі тэрор, ён не здолаў рэвалюцыйнай волі і энэргіі пралетарыяту і працоўных мас Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны.

Буржуазны друк ня можа ўтаіць та го факту, што рабочыя пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі актыўна рыхтуюцца да дня 1-га Мая. На вулі цах зьвешваюцца чырвоныя сьцягі з заклікам да рабочых і ўсіх працоўных у дзень першага мая выйсьці на дэманстрацыю супроць фашысцкага ўрада голаду і вайны, за дыктатуру пралетарыяту, за рэвалюцыйны выхад з крызісу, у абарону СССР.

Турэцкі прэм'ер міністр у СССР

Учора прыбыў у Маскву прэмьер-міністр Турэцкай рэспублікі Ісмэт-Паша ў суправаджэньні міністра замежных спраў Тэфік-Бея, генэральнага сакратара народна-рэспубліканскай партыі Рэджэд-Бея і іншых выдатных дзяржаўных, грамадзкіх і навуковых дзеячоў сучаснай Турцыі.

ІСМЭТ-ПАША.

Крывавыя баі сялян з жандармэрыяй у Румыніі

ВЕНА. 26-4. Паводле паведамленьня румынскай газэты «Дзэмінеацца» ўчора ў Санфаляне, блізка Клаўзэнбэрга, ад былася крывавая сутычка памёж жандарамі і сялянамі, якія спрабавалі рубіць лес.

Жандары далі некалькі залпаў, забілі 2 сялян і 2 цяжка пранялі. Аднак пад напорам сялян жандары вымушаны былі адступіць. Для заспакаеньня сялян з Клаўзэнбэрга высланы узмоцненыя паліцэйскія падмацаваньні.

У Саконце блізка Сатулмары, сяляне таксама заўладалі лесам, прагнаўшы жандарскія атрады. Сутычкі памёж сялянамі і жандарамі мелі месца таксама ў розных мясцох Трансільваніі і Букавіны.

У Кішыневе з усіх паветаў штодня паступаюць весткі аб масавым адмаўленьні сялян ад плацяжоў па недаімках і падатках.

За інтэрнацыянальны адзіны клясавы фронт барацьбы супроць капіталу

БЭРЛІН. 26-4. Уваходзячы ў Прафінтэрн інтэрнацыянал маракоў і парт. вікоў апублікаваў першамайскую адозву з наступнымі лёзунгамі: 1 мая ў порце і на суднах не праводзіць ніякіх работ. Усе на масавую дэманстрацыю супроць вайны і голаду! Прапануем усім маракам зьявіцца са сваіх суднаў для таго, каб разам з партыямі, водніцкімі, сваімі беспрацоўнымі таварышамі і рабочымі іншых галін прамысловасьці ўдзельнічаць у масавых мітынгах і дэманстрацыях.

Няхай жыве інтэрнацыянальны адзіны фронт барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны, супроць эксплёатацыі, за рэвалюцыйны выхад з крызісу.

Баі рабочых з паліцыяй

ПАРЫЖ. Паводле паведамленьня «Юманіте» у Малазе (Гішпанія) некалькі тысяч беспрацоўных дэманстравалі па вуліцах гораду з патрабаваньнем хлеба і работы. Дэманстранты накіравалі делегацыю ў гарадзкую думу. Паліцыя спрабавала арыштаваць делегатаў, аднак, пад напорам рабочых, вымушана была адступіць. Тады ў ход была пушчана жандармэрыя, якая атакавала дэманстрантаў. Бой працягваўся больш гадзіны. Ёсьць многа параненых.

У Варай-Дэ-Вэйга (правінцыя Арэнсе) 200 сялян-беднякоў, якія зьявіліся ў мясцовае самакіраўніцтва з пратестам супроць непасільных падаткаў, былі спатканы стрэльбавым агнём жандармэрыі. І селяніны забіты, многа параненых.

Атрады жандармэрыі з кулямётамі зьдзіраюць падаткі

Баявы адпор сялянства

ВЕНА. 26-4. Паводле паведамленьня італьянскіх і баўгарскіх карэспандэнтаў з Тыраны (Албанія), у апошнія часы ў паўднёвай частцы Албаніі адбываюцца наступныя крывавыя сутычкі югаслаўскіх жандармаў з албанскімі сялянамі ў сувязі са зборам падоймак і калёніяльнай палітыкай югаслаўскага ўраду. Вялізарная колькасьць сялян паранена і забіта.

Гэтымі днямі ў ваколіцах Пісканьего і Бэрато адбылася форменная бойка жандармэрыі з сялянамі. Жандарскія атрады пусьцілі ў ход кулямёты. Дзе сяткі сялян забіты, 12 жандараў паранена.

„Рэпэтыцыя" лёкауту

ВАРШАВА. 27-4. Учора а 12 гадзіне дня ў цэнтры Варшавы, на вуліцы Маршалкай быў забіты стрэлам з рэвальвэра галоўны дырэктар Жыраардаўскіх тэкстыльных фабрык Келер-Бадзэн. Страляўшым апазнаны нядаўна звольнены са службы служачы дырэкцыі жыраардаўскіх фабрык.

Усе буйныя тэкстыльныя заводы ў Лёдзі, пачынаючы з 30 красавіка пры пыняюць работу на 10 дзён. Рабочыя, такім чынам, працяць 10-дзённы заработок. Мерапрыемствы безумоўна зьяўляецца ўродкам націску на рабочых з мэтаю прымусіць іх да згоды на зьніжэньне заработку. 10-дзённая «рэпэтыцыя» лёкауту павінна падкараць хвалю на плянуй прадпрыемнікаў гатоўнасьць да абароны супроць наступленьня капіталістаў.

Калектыў супрацоўнікаў рэдакцыі і выдавецтва газэты „Савецкая Беларусь" выказвае спачуваньне

ШАСТАКОВУ Паўлу Пятровічу

з прычыны заўчаснай сьмерці ЯГО СЯСТРЫ

АЛЯКСАНДРЫ ПЯТРОЎНЫ

А. Сталевіч, О. Конакоцін

Да пытаньня аб беларускай мове

Нацыянальная палітыка камуністычнай партыі ўвесь час накіравана на тое, каб забясьпечыць БССР, як і ўсім раней адсталым краінам і абласьцям, што ўваходзяць у Савецкі Саюз, больш высокія тэмпы разьвіцьця і гэтым даць ім магчымасьць ліквідаваць мінулую спадчыну царскага калёніяльнага рэжыму і дагнаць у разьвіцьці сацыялістычнага і культурнага будаўніцтва перадавыя цэнтры Саюзу. Гэта задача была вельмі яскрава фармулявана і ў рэзалюцыі X-га зьезду РКП(б): «Задача партыі заключаецца ў тым, каб дапамагчы працоўным масам неякрайскіх народаў дагнаць цэнтральную Расію, якая пайшла наперад». Лепшым доказам ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі зьяўляецца БССР, якая пры брацкай дапамозе пралетарыяту Саюзу расьце і мацнее, як сацыялістычная краіна, апярэджаючы ў тэмпах разьвіцьця спадчыну тэмпы ўсяго Саюзу.

Нацыянальная палітыка ёсьць адна з асноўных частак пытаньня дыктатуры пралетарыяту, яе ўмацаваньня да пераходу да бясклясавага грамадзтва, яна ёсьць адзін з галоўных моментаў у аб'яднаньні народаў, якія вызваліліся і якія вызваляюцца, ідучы да свайго Кастрычніка.

Адным з вузлавых пытаньняў сусьветнай рэвалюцыі зьяўляецца нацыянальнае пытаньне. Марксызм-ленінізм тэзіс самаазначэньня нацый як да ад дзяленьня мабілізаваў і мабілізуе ў барацьбе супроць імпэрыялізму і фашызму мільённыя масы рабочых і сялян і шматмільённыя рэзэрвы сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі, якія знаходзяцца ў прыгнечаных краінах і калёніях.

Менавіта так і толькі так падыходзіць да нацыянальнага пытаньня ўсе камуністычныя партыі, якія аб'яднаны пад сьцягам Леніна, пад сьцягам Камінтэрну.

Правільная пастаноўка пытаньня нацыянальнай палітыкі ва ўмовах Заходняй Беларусі дае магчымасьць КПЗБ мабілізоўваць шырокія масы працоўных на барацьбу з фашызмам за Кастрычнік на Захадзе. Пасьлядоўная барацьба за ленінскую нацыянальную палітыку ва ўмовах БССР зьяўляецца пачуткай ушчэнленьня шырокіх колаў працоўных у будаўніцтва сацыялізму і ўмацненьня брацкага аднаўства працоўных усіх нацыянальнасьцей. І ў Заходняй Беларусі і ў БССР камуністычныя партыі КПЗБ і КП(б)Б, праводзячы нацыянальную палітыку, дасягнулі вялізарных посьпехаў—КПЗБ у выдрыхтоўцы мас да бояў за Кастрычнік, —КП(б)Б—у замацаваньні дыктатуры пралетарыяту.

Адным з асноўных пытаньняў у ажыцьцяўленьні палітыкі зьяўляецца пытаньні мовы. Прапаганда ідэй камунізму, ідэй Маркса—Леніна на роднай мове, на мове шырокіх мас паскарае працэс аўладаньня масамі гэтых ідэй. Не задарма-ж ворагі рэвалюцыі вялі і вядуць барацьбу з камуністамі на гэтым вучастку, яны ўсялякімі спосабамі імкнуцца засьмецьціць мову старым славенскім хламам, выступаючы супроць усяго новага ў мове што нясе рэвалюцыйная барацьба. Чым больш завяршаюцца клясавыя супярэчнасьці, тым больш шалёна мракобесы капіталу б'юцца за свае пазіцыі і ў пытаньнях мовы, скарыстоўваючы ўсё ўменьне ашукваць масы ў скрытай форме і прыбягаючы да манэўраваньня ў сваім лягеры з мэтай адагнаць увагу мас ад непарэднай барацьбы.

У Заходняй Беларусі за апошнія часы на старонках беларускага нацыянал-фашысцкага друку падняліся палемікі па пытаньнях мовы паміж двума агентамі польскай акупацыі, пагромшчыкамі беларускага нацыянальнага зьвызваленчага руху Янкам Станкевічам і А. Луцкевічам.

Першы, Янка Станкевіч, кормячыся хлебам акупантаў, усямерна стараецца ўсіцца ў большую іх ласку, апрыўдаць давер'е капіталістычных акупантоў. Гэты самы Янка Станкевіч выслужыўся калечаньнем мовы праз увядзеньне сьмеху вартых архаізмаў, пра выдзеньнем прадаўніцтва і фанэтыкі беларускай мовы часоў панічных і фэадалізму. Робіць ён гэта пад лёзунгам «захаваньня самабытнасьці» мовы ў процівагу абноўленаму за часы рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР лексікону працоўных мас. Браны нацыянал-фашыст Янка Станкевіч выконвае заказ польскага імпэрыялізму і беларускай буржуазіі на прынцыпе ідэалёгічным.

Яго «дэфэосы» і скажэньні ў галіне мовазнаўства зьяўляюцца складамі частак усёй яго контрэвалюцыйнай дзейнасьці, накіраванай на прыдушэньне рэвалюцыйнага нацыянальна-вызваленчага руху супроць працоўных мас Заходняй Беларусі, на пашырэньне польскай імпэрыялістычнай акупацыі і на БССР. Праз гэтую «самабытнасьць» мовы, якую (самабытнасьць) так стараніна фарсавалі і нацыянал-дэмакраты ў БССР, Янка Станкевіч і кампанія ідэалізуюць беларускую старыну—росквіт беларускай буржуазнай дэмакратыі, хочуць адвесьці увагу мас ад рэвалюцыйнай барацьбы за сацыялізм і нацыянальнае вызваленьне, ад барацьбы рабочага сялянскую Савецкую Беларусь.

Для беларускіх нацыянал-фашыстаў, як ідэолёгаў беларускай буржуазіі, кулацтва, вельмі не да ўспадобы новатворы, увядзеньні ў мову самімі масамі, новатворы, якія адбіваюць клясавую барацьбу ў беларускім народзе, адбіваюць перажогу беларускіх працоўных мас над вучыцкі сваіх і чужых эксплёататараў. Гэтыя новатворы, якія зьяўляюцца па сутнасьці разьвіцьцём беларускай мовы, нашыя нал-фашысты і нацыянал-дэмакраты спатыкаюць у штыкі, называючы іх русыцызмам і засьмечаньнем, калечаньнем мовы. Ня гледзячы на тое, што, напрыклад, слова Саветы стала сярод шырокіх працоўных мас Заходняй Беларусі так блізкім, арасэмельным і зазнавала права грамадзтва, як слова хлеб, воля, пашпарт, нацыянал-фашысты ўпарта ўжываюць «рады», «радавая Беларусь» і да т. п. Побач з тым, яны ахвотна поўнай жменяй густа расьсяюць паленізмы ў мове, і, апрыўдзіўшы гэта «пістарычнай свяцкай мовай польскага і беларускага народаў», фактычна замацоўваюць капіталістычна-абшарніцкую польскую акупацыю Заходняй Беларусі і садзейнічаюць фашызацыі працоўных мас.

Усе гэтыя заслугі «філёлёга» Янкі Станкевіча ў здразе беларускага народу выклікалі асабліваю прыхільнасьць з боку польскіх фашысцкіх улад, якія адобрылі пана «навучонага» ласкамі і прызнаньнямі. Я. Станкевіч да пушчаны да выкладаньня беларускай мовы ў Варшаўскім і Віленскім унівэр сытэтах і ў Віленскай духоўнай семінарыі. Разам з тым ён апрымлівае ас бістую пайдачку ад ураду на выданьне часопісу «Родная мова». Цікава між іншым тая акалічнасьць, што пан Янка Станкевіч на кожным нумары часопісу не саромецца пісаць, што часопіс «Выдаецца з дапамогаю міністэрства веры і асьветы». І ня дабуча. Пад мэркай міністэрства веры і асьветы заседы зьбіраліся слаўныя арэны культуры ад дэфэнзывы. Янка Станкевіч толькі самаазначаецца.

У нумары шостым за 1931 г. «шакоўны» ліцэйцы ад фашызму ў артыкуле «Слоўчык» дае шмат зручных доказаў супроць новатворў у мове. У Станкевіча замест «бяжыць»—«порце», замест «чытаць»—«чытар», замест «тэлефон»—«слухалка» і г. д. Той-жа Станкевіч пад шыльдаю Бра чыслаў Скарынін у гэтым фашысцкім сьпіску («Родная мова») зьводзіць агідны паклёп на слаўнага рэвалюцыянера Заходняй Беларусі Тарашкевіча, «рэфармуе» яго граматыку і «практыкуецца» ў сваіх ліцэйстычных выкрутасах. Абвінавачваючы Бр. Тарашкевіча ў маскалізму Скарынін «выкрывае гэтую ідэалёгію» Тарашкевіча такім прыкладам—замест «бедняк» мае быць па Скарыніну «бодны (або галеча)», замест «прачка»—«смыцьцёха», прыкладам «пайшла каса на камень» дыфэнзіў ны ліцэйцы лічыць агідным прыклад дам здрадны (?) Тарашкевіча, і прапануе замяніць яе «крыўскай» чорт на паганага папаў» і г. д.

У кожным новым слове «ліцэйцы» Станкевіч бачыць адраду беларускаму руху, прыпісваньне мовы з боку камуністаў і кажа проста: «як раней царскі ўрад, так пэпер камуністычны ведуць абрусеньне беларускага народу» (стар. 182 «Родная мова»). Такім чынам у нацыянал-фашыстаў кожны новатвор мас, што ўзбагачвае, спрашчае мову або «адрада» або «абрусеньне беларускага народу».

Конкурэнцыя за больш ласы капалак з рук польскіх паноў і заскокі пана Станкевіча выклікалі ў беларускага обэр-фашыстка Луцкевіча публіцыстычны сьверб. Ён на шпаргалках сва ёй газэты выступіў з абурэньнем супроць «анархізаваньня нашай мовы» і стаўшы ў рыцарскую позу, заклікае да абароны і ўдасканаленьня беларускай мовы».

«Гэта ёсьць першая і галоўная задача нашага асьветнага грамадзянства»—бубніць «Беларускі эвэн» Луцкевіча, імкнучыся адцягнуць увагу працоўных мас ад іх галоўнай задачы